**Прамая лінія**

## АД ПЕНСІІ ДА ДАПАМОГ

Адрасная сацыяльная дапамога, пенсіі, падтрымка ветэранаў, выплаты да 65-годдзя Перамогі — усё гэта стане тэмамі «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! **Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» пройдзе 5 красавіка з 12 да 13 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.**

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 САКАВІКА 2010 г. СУБОТА № 56—57 (26664—26665)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «БЕЛАРУСЬ ПАВІННА АДЫСЦІ АД ЗАЛЕЖНАСЦІ Ў ЭНЕРГЕТЫЧНЫМ ПЛАНЕ»

**Пытанні забеспячэння энергетычнай незалежнасці Беларусі будуць вырашаны ў найбліжэйшыя пяць гадоў. Аб гэтым заявіў 26 сакавіка Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагародаў.**

«Нам неабходна забяспечыць бяспеку нашай краіны. А аснова нашай бяспекі (на вялікі жаль, так склалася гістарычна) залежыць ад пытанняў энергетыкі. Таму мы сёння так актыўна па ўсім свеце шукаем сродкі, новыя тэхналогіі. Вядома, я чакаю ад нашых вучоных, праекціроўшчыкаў новых ідэй. Нам сапраўды нельга перакрываць рэкі, як гэта робяць у гарах, закрыем жа адну рэчку — паўкраіны зальём. Нам патрэбны новыя тэхналогіі. Нам, нарэшце, трэба адысці ад залежнасці — каб нас не штурхалі пастаянна, указваючы на тое, што мы жывём за кошт некага», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Мы павінны даказаць, што мы — цывілізаваныя, адукаваныя, моцныя духам людзі, здольныя будаваць сваё жыццё так, як мы гэтага хочам, — падкрэсліў ён. — Гэта галоўнае ў маім жыцці, маёй дзейнасці. Спадзяюся, што я буду не адзін у вырашэнні гэтай праблемы. І мы яе ў найбліжэйшыя пяць гадоў абавязкова вырашым, я ў гэтым упэўнены». «Вы павінны разумець: усё, што мы сёння робім, накіравана на захаванне суверэнітэту нашай дзяржавы. Гэта найважнейшая праблема, якая сёння вырашаецца, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У свеце практычна не засталося такіх месцаў, як Беларусь. Усе да каго-небудзь ужо далучыліся, увайшлі ў склад. Усе дзяржавы — малыя, сярэднія — скачуць пад чыю-небудзь дудку. Вядома, мы разумеем, што быць Белай Руссю сёння не так проста, і незалежнасць не так проста даецца. Але мы павінны зрабіць усё, каб захаваць сваю дзяржаву».

Прэзідэнт адзначыў, што гэта «не які-небудзь выпад супраць волі часу. Проста наш народ заслужыў, каб мець на гэтай планеце свой кавалак зямлі, каб нашы дзеці і ўнукі нас не папракалі за тое, што мы не захавалі і не перадалі ім у спадчыну гэту зямлю — куток, куды яны заўсёды могуць прыехаць, дзе іх заўсёды будуць чакаць іх родныя і блізкія. Вось простая логіка цяперашніх падзей». «І на тыя крыкі, якія сёння чуюцца практычна з усіх бакоў (ды і ў нас ёсць аматары паяхіднічаць, ім усё роўна, з кім мы сябруем — з Захадам або Усходам, усё роўна дрэнна), адказ просты: мы хочам захаваць сваю дзяржаву».

Аляксандр Лукашэнка ўчора ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і аб'явіў Падзяку 47 грамадзянам Беларусі. «Для нашага грамадства важны прыклад людзей, якія ўмеюць не толькі мысліць сучасна, творча, але і дабівацца важкага выніку, сваімі канкрэтнымі справамі прыносіць карысць Айчыне», — адзначыў Прэзідэнт.

Значную групу сярод узнагароджаных склалі рабочыя і спецыялісты прадпрыемстваў энергетычнага комплексу. Сярод узнагароджаных нямала прадстаўнікоў Узброеных Сілаў Беларусі, спецыялістаў вытворчых аб'яднанняў і канструктарскіх бюро, якія працуюць на абарону. Прэзідэнт адзначыў і тое, што ў ліку ўзнагароджаных — работнікі мастацтва, навукі і адукацыі.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў подзвіг загінулых у Польшчы беларускіх лётчыкаў, якія былі ўзнагароджаны ордэнамі «За асабістую мужнасць». Уручаючы ўзнагароды ўдовам загінулых, Прэзідэнт сказаў: «Палкоўнікі Аляксандр Жураўлевіч і Аляксандр Марфіцкі праявілі асаблівую мужнасць. Яны здзейснілі подзвіг: у аварыйнай сітуацыі адвялі самалёт ад населенага пункта і цаной свайго жыцця не дапусцілі гібелі грамадзян. Такі самаахвярны ўчынак выклікае пачуццё гордасці за суайчыннікаў і ў той жа час напаўняе нашы сэрцы глыбокім смуткам аб загінулых».

Ордэнам Айчыны II ступені ўзнагароджаны вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага Расціслаў Янкоўскі. Ордэн «За службу Радзіме» II ступені атрымаў намеснік міністра абароны генерал-маёр Іван Дырман. Аналагічны ордэн III ступені — намеснік камандзіра авіяцыйнай эскадрыллі 927-й знішчальнай авіяцыйнай базы маёр Сяргей Міхайлаў. Ордэна Пашаны ўдастоены дырэктар Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі для адораных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці Уладзімір Шыцько. Ордэна Францыска Скарыны — член Беларускага саюза музычных дзеячаў Іна Зубрыч. Акрамя таго, былі ўручаны медалі «За адвагу», «За адзнаку ў воінскай службе», «За працоўныя заслугі». Сярод узнагароджаных — паэт, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Мікалай Мятліцкі, актрыса Ірына Нарбекава, дэкан факультэта рускай філалогіі БДПУ імя Максіма Танка Васіль Старычонак.

Прэзідэнт пажадаў усім узнагароджаным, каб гэта былі не апошнія іх узнагароды.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЖЫЦЦЁВАЯ РАЗМОВА

**Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Зянон ЛОМАЦЬ 25 сакавіка правёў прамую лінію з жыхарамі Магілёўскай вобласці.**

### Малочныя рэкі мялеюць

Наталлі Пятроўне, жыхарцы вёскі Сапрынавічы Мсціслаўскага раёна, апошнім часам даводзіцца прымусова займацца фізкультурай. Сутнасць у тым, што жанчына трымае карову і здае малако дзяржаве, а цяпер без паўгадзіннага шпацыру ад дома да шашы з двума вёдрамі малака ў руках не абысціся. Раней, патлумачыла Наталля Пятроўна Зянону Кузьмічу, для збору малака да кожнай хаты пад'язджала фурманка. Цяпер жа па малако ездзіць аўтамабіль, таму ад гаспадароў патрабуюць дастаўляць малако да асфальтавай дарогі.

— Мне ўжо 74 гады, і цяжка з 20 літрамі малака паўзці раніцай паўкіламетра, — казала жанчына. — А ўлетку, на траве, малака будзе яшчэ болей. Я на год здаю дзяржаве каля 6 тон малака. І за што нам цяпер такая насмешка? Нездарма жыхары Сапрынавічаў пазбаўляюцца жывёлы, і цяпер засталося ў нашай вёсцы толькі 26 кароў.

— Я ў былым вясковы жыхар і мяне хвалююць пытанні, якія датычацца асабістых сялянскіх падворкаў, — прызнаўся Зянон Ломаць. — Мне падаецца, што стаўленне з боку мясцовых органаў улады да Наталлі Пятроўны і такіх, як яна, проста нікуды не вартае. Пажылая жанчына носіць у сваіх руках малако, каб здаць дзяржаве, а сельскі Савет, відаць, гэта абсалютна не хвалюе. Ды такім людзям дзякаваць трэба, што яны трымаюць жывёлу і здаюць малако. Гэта дадатковы даход пенсіянераў і, урэшце, гэта іх жыццё.

З падобнымі прэтэнзіямі да ўлады звярнуўся да старшыні КДК пенсіянер з Дзямідавіцкага сельсавета ў Касцюковіцкім раёне: ён паскардзіўся на перапынкі ў зборы малака і праблемы з яго ўлікам.

— Гэта поўная абыякавасць, — зрабіў выснову Зянон Ломаць. — Мы будзем дэталёва разбірацца. Найбліжэйшым часам вывучым, як улады ставяцца да асабістых падсобных гаспадарак, як аказваюць ім дапамогу. Сёння трэба дапамагчы, асабліва старым людзям, вырасціць бульбу і збожжавыя, забяспечыць кароў сенам. Вяскоўцы гэта заслужылі.

### Дамы ў расколінах

На «прамой лініі» ў Магілёўскай вобласці зарэгістравалі 6,5 тысячы спробаў датэлефанавацца. Зянон Ломаць гутарыў з 48 скаржнікамі, а яшчэ паўсотні зваротаў запісалі аператары.

— Я сёння чакаў ад магілёўцаў болей канкрэтных прапаноў: пра тое, што нам перашкаджае жыць лепей, якія ёсць праблемы і як іх вырашаць, — прызнаўся старшыня КДК. — Так, прынамсі, было нядаўна ў Віцебску: там кожны другі чалавек на «прамой лініі» раіў, як добраўпарадкаваць горад.

На Магілёўшчыне больш паведамлялі пра дрэнную якасць будаўніцтва ў вёсцы. Жанчына з пасёлка Галынец Магілёўскага раёна паведаміла: толькі ўвосень яны атрымалі ад гаспадаркі новы дом, але за першую ж зіму сцены звонку пакрыліся расколінамі. З вёскі Масток таго ж Магілёўскага раёна падобная скарга: у доме спачатку рассохліся драўляныя падлогі, потым з'явіліся шчыліны пад вокнамі, а цяпер — расколіны ў сценах.

— Будаўнікам заробкі павялічылі, але, на жаль, якасць прапарцыянальна не ўзрасла, — пракаментаваў Зянон Ломаць. — Ну як гэта так: нядаўна засяліліся ў дом, а ён ужо перакрыўся? Будзем разбірацца.

Праблемы з будаўніцтвам ёсць і ў горадзе. Традыцыйнымі для «прамых ліній» КДК сталі пытанні аб дзейнасці жыллёва-будаўнічых кааператываў. На гэты раз паскардзілася магіляўчанка, чыю кватэру ў доме на вуліцы Турава будуюць з 2006 года. Тэрміны будаўніцтва неаднаразова пераносіліся, разам з імі прыватны забудоўшчык мяняў да большага і кошт жылля.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

### СЯЎБА ПАЧАЛАСЯ

Восем раёнаў Брэстчыны прыступілі на гэтым тыдні да сяўбы ранніх яравых культур. Да масавай сяўбы прыступяць ужо з 1 красавіка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

Марыя ЛУКАШЭВІЧ, маці чацвярні:

## «ВЫХОДЗІЛА ЗАМУЖ І НЕ ДУМАЛА, ШТО БУДЗЕ СТОЛЬКІ ДЗЯЦЕЙ»

Настасся ЗАНЬКО

**Пра тое, што ў яе будзе чацвёра дзяцей, Марыя Лукашэвіч з Ашмянаў даведалася толькі на трэцім УГД. Спачатку ёй казалі, што будзе двойня, пасля знайшлі трайню, а падчас трэцяга абследавання канчаткова стала зразумела, што сям'я Лукашэвічаў павялічыцца на чатыры чалавекі: дзве дзяўчынкі і два хлопчыкі. Бабуля не верыла, прабабуля плакала і маліла Бога, каб даў здароўя, а маладая пара вырашыла нараджаць...**

Прыгожы старажытны беларускі гарадок Ашмяны месціцца на маляўнічых узгорках каля невялікай рачулкі. Жыхары горада ганарацца сваімі старадаўнімі будынкамі, царквой і касцёлам, якія знаходзяцца побач. Цяпер гонар ашмянцаў — і чацвёра дзяцей Марыі Лукашэвіч.

— У нас такое ўпершыню, — расказваюць у Ашмянскім райвыканкаме. — Ну, было, каб тройняў ці двойняў нараджалі. А чацвёра — гэта для нас незвычайна.

Ды і ў сталіцы, дзе нараджала Марыя Лукашэвіч, апошнія пяць гадоў такіх выпадкаў не было.

**ВОСЕМ ЧАЛАВЕК У ДВУХПАКАЁВАЙ КВАТЭРЫ**

Дом, дзе жыве сям'я Лукашэвічаў, месціцца ў квартале Будаўнікоў, гэта самы ўскраек Ашмянаў. Ад цэнтра дабірацца сюды хвілін дваццаць пешшу.

— Добры дзень, праходзьце. Ой, толькі мы не ўсе разам: муж на працы. Гэта нічога? — сустракае нас маладая мама.

Мы праходзім у адзін з пакояў двухпакаёўкі, у якой цяпер (разам з дзецьмі) жыве восем чалавек. Акрамя Марыі і яе мужа Уладзіміра, тут і бабуля з прабабуляй.

— Цесна тут. А куды тут чацвёрты ложак паставіць? — шэпча бабуля Рэгіна. — Па чарзе то сюды аднаго пакладзём, то туды. Разам усіх класці таксама немагчыма. Яны ж адно аднаго за рукі пачынаюць хапаць.

— Глядзіце, як мурашы! — гледзячы, як махаюць рукамі дзеці ў сне, усміхаецца бабуля.

Два дзіцячыя ложкі і раскладзеная канапа. І ў кожным месцы ляжыць маленькі чалавечак. Карціна нечым нагадвае дзіцячы садок. Мы ціхенька прысаджваемся на канапу, размаўляючы напаўголасу, каб не разбудзіць дзяцей, аднак першымі прачнуліся дзяўчаты, а за імі падхапіліся і хлопцы.

— Прачынаемся мы звычайна рана, — гушкаючы старэйшага, Кірыла, расказвае Марыя. — Карына можа прачнуцца і ў пяць, а пасля будзе ляжаць у ложку і сама гуляцца, не будзіць нікога. Потым муж прачынаецца на працу і тады да мяне ўсіх кладзе. У кожнага свой характар. На другі дзень у шпіталі была самая неспакойная Карынка. А цяпер наадварот, Вадзім стаў буяніць. І Кірыл стаў нешта такі капрызлівы. Уяўляю, што будзе, калі зубы пачнуць рэзацца...

— Каб жа яны ўсе разам засыналі. Дык мы б і паесці схадзілі разам, — тлумачыць маці Марыі Рэгіна Раманаўна. — А то ж па чарзе.

**ЧАТЫРЫ БРЫГАДЫ,**

**КАБ ПРЫНЯЦЬ РОДЫ**

Марыя і Уладзімір Лукашэвічы ажаніліся тры гады таму. Яму зараз 29, яна на тры гады маладзейшая. Марыя працавала старшым касірам у мясцовым аддзяленні «Белаграпрамбанка», а Уладзімір — манцёрам у СМУ-4 Ашмянаў.

— Калі я выходзіла замуж, то нават і не думала, што ў мяне будзе столькі дзяцей, — усміхаецца Марыя, трымаючы на руках ужо дачушку. — Думалася, будзе максімум двое. Нават пра блізнятаў не думалі. Пра колькасць дзяцей мы даведваліся паступова. Пасля кожнага даслндавання колькасць дзяцей «павялічвалася». Спачатку было двое, пасля трое. І ў рэшце рэшт аказалася, што чацвёра. Муж даведаўся і сказаў: «Ну, дзе трое, там і чацвёра».

> **Бабуля не верыла, прабабуля плакала і маліла Бога, каб даў здароўя, а маладая пара вырашыла нараджаць...**

— Яна прыйшла да мяне і сказала: «Мамка, чацвёра ў мяне будзе». Я кажу: «Ты жартуеш ці што? Кожны раз прыедзеш, усё новае»,— трымаючы на руках дзяўчынку, расказвае бабуля Рэгіна.

Нараджала Марыя ў цэнтры «Маці і дзіця». Дата нараджэння якраз супала з днём нараджэння нябожчыка бацькі Марыі. Пятага лістапада. Ён не паспеў нават даведацца, што ў яго дачкі народзіцца столькі дзяцей.

Урач, які прымаў роды, за свой дваццацігадовы стаж упершыню меў справу з чацвярнёй.

— Мяне хацелі падключыць да апаратаў, каб раніцы дачакацца. Таму што, каб прымаць у мяне роды, патрэбна было чатыры брыгады, — расказвае Марыя. — Але пастараліся і прынялі адной брыгадай. Першым нарадзіўся Кірыл, пасля Вадзім, за імі Ірына і Карына. Дзеці важылі ад 1,2 да 1,5 кг. А ўжо 11 сакавіка Кірыл у нас быў 7,5 кг, Вадзім — 5,8, Карына 5,4, Ірына — 5,3.

Аднак дзяцей маці ўбачыла не адразу. Калі ў снежні быў каранцін у Мінску, маці адправілі дамоў.

— Іх выходжвалі і, каб не каранцін, то можна было б наведваць, — успамінае Марыя. — Перажывала, кожны дзень тэлефанавала. Яны ў Мінску былі, а я тут. І Новы год сустракалі толькі з двума. Астатнія заставаліся яшчэ ў бальніцы.

**«У ПРАПРАБАБУЛІ БЫЛО ШЭСЦЬ ДВОЙНЯЎ»**

У родзе Лукашэвічаў двойні, як аказалася, не рэдкасць. У мужа Уладзіміра дзве сястры з двойняў. А па мацярынскай лініі ў Марыі было ажно некалькі такіх выпадкаў.

— У нас у родзе яшчэ ў маёй бабулі па маме шэсць разоў было па двойні, — кажа Рэгіна Раманаўна.

Сямейная гісторыя не захавала, як са сваімі дванаццаццю дзецьмі спраўлялася прапрабабуля Марыі, а вось ёй дапамагаюць і мама, і бабуля.

— Мама звольнілася са сваёй працы, каб нам дапамагаць. Яна жылоўшчыцай на мясакамбінаце працавала, — кажа Марыя, трымаючы на адной руцэ адно дзіця і супакойваючы другой рукой другое.

— Нам сказалі, што дадуць няньку. Але ж яна адпрацуе з васьмі да пяці, а пасля і да пабачэння, — тлумачыць свой выбар Рэгіна Раманаўна. — А тут і ўначы ўстаць. Таму за няньку пайшла я. Вядома, на працы больш зарабляла б, а ім хто дапамог бы? І тое, і гэта патрэбна. Ды і ўсе жвавенькія, кожны нешта патрабуе. Але скажыце, як такіх не любіць!

**«НА КОЖНАГА 125 ТЫСЯЧ У МЕСЯЦ»**

Менавіта столькі, па падліках Марыі, складаюць выдаткі на харчаванне кожнага дзіцяці.

— Дзякуй Богу, у нас зараз харчаванне бясплатнае, — кажа Марыя. — Цяпер яны ў нас на малочных сумесях. Мне выпісваюць рэцэпт. А пасля можна выбіраць, беларускімі ці замежнымі сумесямі карміць. Іх яшчэ ў радзільні кармілі беларускімі сумесямі, таму і я вырашыла нічога не мяняць.

За памперсамі і ўсім астатнім сям'я ездзіць закупляцца на аптовыя кірмашы ў Мінск.

— Калі мы бралі ў Мінску памперсы, то ў «Еўраопце» яны каштавалі 50 тысяч, а ў нас, у Ашмянах — 70, — тлумачыць Марыя.

У будучым сям'я настроена на большы заробак. Першапачаткова філіял банка, дзе працавала Марыя, выдзеліў грашовую дапамогу, а пасля галаўны офіс банка падараваў сям'і васьмімесны аўтамабіль і зрабіў грашовыя ўклады для дзяцей.

Райвыканкам уручыў шматдзетнай сям'і ключы ад новай кватэры. Гэта пяціпакаёўка — дзве сумешчаныя кватэры, таму што такіх вялікіх у новабудоўлях Ашмянаў проста не было. Кватэру выдалі па-за чаргой пад ільготны крэдыт на 40 гадоў пад адзін працэнт. Як паведамілі Лукашэвічам у райвыканкаме, 70 працэнтаў ад сумы крэдыту возьме на сябе дзяржава. Да двух гадоў дзеці будуць атрымліваць бясплатнае харчаванне.

— У кватэры ў нас ужо паклеена, кафля пакладзена, лямпачкі вісяць, шторкі ёсць, — расказвае Марыя. — Але пакуль пераязджаць не збіраемся, пачакаем яшчэ. Там яшчэ балота, няма ніякіх сцяжынак, нават пагуляць з дзецьмі няма дзе.

— Неяк выкараскаемся. Дапамогу на дзяцей яшчэ не атрымлівала — нават не ведаю, колькі. Але, як кажуць, Бог даў дзяцей, дасць і на дзяцей, — перакананая Марыя.

**Выбары-2010**

## АДСЕЎ НЯЗНАЧНЫ

*98,3 адсотка ахвотных сталі кандыдатамі ў дэпутаты*

**З 25 477 вылучэнцаў па ўласнай волі сышлі з дыстанцыі 122 (0,5 адсотка) — адклікалі свае заявы. 318 прэтэндэнтам (а гэта 1,2 адсотка) «дапамаглі» сысці выбаркамы.**

— У параўнанні з мінулымі выбарамі адмоў стала значна менш, і можна сказаць, што яны насілі адзінкавы характар, — каментуе вынікі рэгістрацыі кандыдатаў **сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай ЛАЗАВІК.**

Ён мяркуе, што прымяненне новых нормаў выбарчага заканадаўства зрабіла працэдуру рэгістрацыі больш лаяльнай. Адсюль і менш адмоўных рашэнняў па рэгістрацыі.

— Рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі выносілася толькі ў тым выпадку, калі ў прадстаўленых грамадзянінам дакументах выяўляліся істотныя памылкі і недакладнасці. Натуральна, што грамадзянін нявылучаны, калі ў яго не было дастатковай колькасці сапраўдных подпісаў ці колькасць несапраўдных перавышала ўстаноўлены заканадаўствам ліміт.

Так, пасля фільтрацыі на старце перадвыбарнай гонкі апынулася 25 035 чалавек. А значыць, конкурс у сярэднім па краіне на ўзроўні 1,2 чалавека на мандат. Пры гэтым максімальная канкурэнтнасць — 3,9 — у сталіцы (па выніках вылучэння яна складала 5,4 прэтэндэнта на акругу), мінімальная — 1,1 — у сельскіх і пасялковых Саветах.

Хто ж яны — гэтыя змагары за права прадстаўляць нашы інтарэсы на мясцовым узроўні? Прадстаўніц слабай паловы ў гэтых шэрагах амаль... палова (45,2 адсотка). Багата і дзейных дэпутатаў — 46,3 адсотка. А вось маладых людзей вельмі мала: толькі 6,2 адсотка. На думку сакратара ЦВК, гэта звязана з тым, што беларускі выбаршчык усё ж робіць стаўку на жыццёвы вопыт...

СТАР. 3

Завяршаецца падпіска на «Звязду» на II квартал. Заставайцеся з намі!

## ПАМЯНЯЎ ШТРАФ НА ХАБАР

**У дачыненні да трох грамадзян Рэспублікі Беларусь Камітэт дзяржаўнай бяспекі завёў крымінальныя справы — за падбухторванне да дачы хабару і атрыманне хабару.**

У студзені гэтага года ўпраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў па Мінскай вобласці і г. Мінску ўвяло штрафныя санкцыі ў памеры 200 млн рублёў пасля праверкі аднаго са сталічных камерцыйных прадпрыемстваў. Для вырашэння пытання аб вызваленні ад штрафу або змяншэння яго памеру прадстаўнік фірмы звярнуўся да сакратара Мінскага транспартнага пракурора, якая валодала сувязямі сярод прадстаўнікоў праваахоўных структур. З дапамогай сваёй сваячкі — работніцы Генеральнай пракуратуры, жанчына арганізавала камерсанту сустрэчу са службовай асобай фінансавай міліцыі. Той каля года таму перайшоў на працу ў Дэпартамент фінансавых расследаванняў з пасады пракурора па наглядзе за законнасцю ў МУС і МНС Генеральнай пракуратуры. Ён і паабяцаў вырашыць пытанне.

У хуткім часе прадпрымальніку паведамілі, што санкцыі ў дачыненні да фірмы будуць адменены ў поўным аб'ёме. Аднак за аказаную паслугу неабходна заплаціць 15 тысяч долараў, якія будуць перададзены адпаведным службовым асобам органаў дэпартамента. Пасля паўтарамесячных ультыматыўных угавораў прадпрымальнік пагадзіўся з прапанаванымі ўмовамі.

Згаданыя асобы былі затрыманы з наяўным супрацоўнікамі КДБ падчас перадачы першай часткі сумы — 10 тысяч долараў. Затрыманыя знаходзяцца ў следчым ізалятары КДБ. Вядзецца следства.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



B&B INSURANCE CO.

## ГОДОВОЙ БАЛАНС ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» за 2009 год

**220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, тел. 209 41 11, 285 76 22**

*лицензия № 02200/0447049, 06.02.2009 г. – 26.03.2014 г., выдана МФ РБ. УНП 101063229*

млн руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Основные средства** | **31 258,4** | **Источники собственных средств, всего** | **18 791,3** |
| **Нематериальные активы** | **87,3** | в том числе: уставный фонд | 10 752,7 |
| **Финансовые вложения, всего** | **5 530,7** | резервный фонд | 715,9 |
| в том числе: | | добавочный фонд | 3 223,8 |
| инвестиции в дочерние общества | – | фонд накопления | 3 645,3 |
| инвестиции в другие организации | 1 173,6 | фонд потребления | 1,4 |
| облигации и другие долговые обязательства | – | целевое финансирование | – |
| прочие финансовые вложения | 4 357,1 | нераспределенная прибыль прошлых лет | 219,9 |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | **69,2** | нераспределенная прибыль отчетного года | 232,3 |
| Дебиторы, всего | 6 352,0 | **Страховые резервы и фонды, всего** | **44 189,4** |
| в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 268,0 | в том числе: страховые резервы | 35 722,8 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | – | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 8 466,6 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 6 084,0 | гарантийный фонд | – |
| **Прочие активы, всего** | **52 098,8** | **Кредиторы, всего** | **30 131,7** |
| в том числе: незавершенное строительство | 611,0 | в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 707,9 |
| материальные ценности и затраты | 3 269,9 | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | – |
| денежные средства | 48 217,9 | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | – |
| собственные акции (доли) | – | заемные средства | 25 695,4 |
| прочие активы | – | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 3 728,4 |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | **–** | **Прочие пассивы** | **2 284,0** |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | **–** | **БАЛАНС** | **95 396,4** |
| **БАЛАНС** | **95 396,4** | | |

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» за 2009 год

млн руб.

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **I. Страхование жизни** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | – |
| Страховые выплаты | 020 | – |
| Изменения резерва по страхованию жизни (+или-) | 030 | – |
| Отчисления в фонды | 040 | – |
| Расходы на ведение дела | 041 | – |
| **Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)** | **050** | **–** |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** Страховые взносы (премии) – нетто перестрахование | 064 | 97 818,7 |
| Изменения резерва незаработанной премии – нетто перестрахование (+ или -) | 067 | 12 870,0 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто перестрахование (+ или -) | 082 | 81 253,2 |
| Изменение резервов убытков – нетто перестрахование (+или-) | 092 | -7 938,8 |
| Изменение других технических резервов (+или-) | 100 | – |
| Изменение других страховых резервов (+или-) | 105 | – |
| Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 873,1 |
| Расходы на ведение дела | 120 | 28 736,1 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | 2,7 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | 2 704,8 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | **130** | **-10 814,6** |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I** | | |
| Операционные доходы | 140 | 37 671,7 |
| Операционные расходы | 145 | 34 316,6 |
| Внереализационные доходы | 150 | 10 567,4 |
| Внереализационные расходы | 155 | 64,3 |
| Платежи и расходы, производимые из прибыли | 156 | – |
| Финансовый результат | 157 | 3 043,6 |
| Использование прибыли | 158 | 2 811,3 |
| **Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)** | **170** | **232,3** |

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ

(С ВЫРАЖЕНИЕМ БЕЗУСЛОВНО ПОЛОЖИТЕЛЬНОГО АУДИТОРСКОГО МНЕНИЯ).

Директору ОАСО «Би энд Би иншуренс» Меднику Борису Бениаминовичу

**Аудируемое лицо:**

Открытое акционерное страхового общество «Би энд Би иншуренс Ко»

220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38/16, к. 2

Впервые зарегистрировано 30.11.1995 г., перерегистрировано Комстрахнадзором при Министерстве финансов РБ 11.07.2001 г. в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101063229. Страховое общество зарегистрировано в качестве налогоплательщика в ИМНС по Первомайскому району г. Минска.

**Аудиторская организация:**

Индивидуальный предприниматель Волчкова Алина Константиновна.

Местонахождение: г. Минск, ул. Жилуновича, д. 37, кв. 47;

УНН: 100961335, свидетельство № 0067877 от 4.03.2002 г. выдана администрацией Заводского района г. Минска, лицензия на осуществление аудиторской деятельности выданная 28.11.2008 года № 02200/0040484 Министерством финансов РБ срок действия до 22 января 2014 г., квалификационный аттестат аудитора № 0000894 от 30.07.2003 года выданный Министерством финансов РБ.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», состоящей из:

- бухгалтерского баланса на 01.01.2010 г.;
- отчета о финансовых результатах;
- приложения к бухгалтерскому балансу за 2009 г.;
- отчет об основных показателях финансово-хозяйственной деятельности страховой организации;
- отчет о движении денежных средств страховой организации;
- отчет о платежеспособности страховой организации;
- отчет о размещении страховых резервов;
- расчета чистых активов;
- пояснительной записки.

Руководство ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности и соответствии совершенных ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

**Мнение.**

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» на 1 января 2010 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2009 г., при этом совершенные ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Аудитор – индивидуальный предприниматель:

Волчкова А.К.

Дата подписания аудиторского заключения:
Дата: 24.02.2010 г.

### З жыцця кантрабандыстаў

# ПЯРСЦЁНАК З «САКРЭТАМ»

**Незаконную спробу ўвозу пярсцёнка адразу з 110 брыльянтамі спынілі супрацоўнікі Ашмянскай мытні. Грамадзянка Беларусі спрабавала ўвезці пярсцёнак на тэрыторыю нашай краіны з Літвы без неабходнага дэкларавання.**

Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, аўтамабіль з парушальніцай прайшоў праз «зялёны калідор», што азначала: у пасажыраў няма рэчаў, што падлягаюць пісьмоваму дэклараванню. Пры гэтым ні пытанні да грамадзян, што знаходзіліся ў салоне, ні праверачны агляд транспартнага сродку ніякіх падазрэнняў не выклікалі. За выключэннем аднаго моманту: адна з пасажырак увесь час спрабавала схаваць свае рукі, на якіх, апроч заручальнага, знаходзіўся толькі адзін пярсцёнак з белага металу. Аднак менавіта апошні меў свой «сакрэт». Калі па просьбе інспектара жанчына павярнула рукі далонямі ўверх, шырокі пярсцёнак з белага металу літаральна заззяў аздабленнем — пазней на ім налічылі 110 брыльянтаў.

Пазней у грамадзян, што знаходзіліся ў тым жа аўто, былі знойдзеныя масіўны залаты гадзіннік (зноў жа з брыльянтавым аздабленнем), некалькі дамскіх сумачак і дарагі плашч (кошт кожнага з гэтых прадметаў перавышаў тысячу долараў), а таксама дакументы, што сведчылі пра набыццё рэчаў у Літве. Паводле дакументаў, агульны кошт пярсцёнка, гадзінніка, сумачак і плашча склаў каля 70 мільёнаў рублёў, што значна перавышае суму, на якую можна свабодна ўвозіць рэчы для асабістага карыстання. Варта нагадаць, што своеасаблівы «ліміт» тут вызначаны ў 1 тыс. еўра на чалавека. Цяпер, адзначылі ў ДМК, па факце недэкларавання распачатыя неабходныя працэсуальныя дзеянні. Прадметы адміністрацыйнага парушэння канфіскаваныя.

**Сяргей ГРЫБ.**

# 171,5 ДОЛАРА ЗА ТЫСЯЧУ КУБАМЕТРАЎ

***Такая сярэднегадавая цана расійскага газу будзе сёлета для Беларусі***

Пра гэта паведаміў намеснік старшыні праўлення ААТ «Газпрам», старшыня савета дырэктараў «Белгазпрамбанка» Андрэй Круглоў. Летась, зазначыў ён, рэспубліка цалкам разлічылася за запазычанасць за газ у канцы студзеня мінулага года. Сёлета, на цяперашні дзень, паводле яго звестак, запазычанасць нашай краіны за расійскі газ складае 94,5 мільёна долараў. На сустрэчы з журналістамі згаданыя лічбы былі не самымі галоўнымі, калі казаць, што размова ішла пра найбольш значныя падзеі з жыцця ААТ «Белгазпрамбанк». Дык вось, падводзячы найбольш значныя вынікі працы гэтага банка ў мінулым годзе, старшыня яго праўлення Віктар Бабарыка зазначыў, што да свайго дваццацігоддзя з дня ўтварэння банк падыходзіць у якасці сістэмаўтваральнага банка для найбольш актыўнай часткі грамадства — сярэдняга класа, свайго асноўнага кліенцкага сегменту. Так, напрыклад, па стане на 1 студзеня гэтага года ў банкаўскай сістэме Беларусі ААТ «Белгазпрамбанк» заняло чацвёртае месца па статутным фондзе, пятае месца — па аб'ёме прыбытку, сёмае — па суме актываў і ўласным капітале. Па шэрагу паказчыкаў Белгазпрамбанк палепшыў сваё становішча ў рэйтынгу банкаў Беларусі, у прыватнасці, па аб'ёме прыбытку ён заняў пятае месца супраць сёмага годам раней.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# Не адчыніліся дзверы

Учора прыкладна ў 15.30 у электрацягніку на станцыі «Пралетарская» не адчыніліся левыя па ходу руху дзверы. Адначасова з грукатам аўтаматычна пачалі адчыняцца-зачыняцца на 5-7 сантыметраў дзверы справа (праз іх на папярэдняй станцыі «Першамайская» адбывалася высадка пасажыраў). Машыніст па гучнай сувязі папярэдзіў, каб людзі адышлі ад дзвярэй справа і падрыхтаваліся да выхаду з вагонаў. Праз 4 хвіліны работнікі станцыі ўручную расчынілі дзверы і выпусцілі пасажыраў на платформу. Пастаяўшы яшчэ хвіліну, пусты электрацягнік, грукаючы дзвярыма, накіраваўся ў бок станцыі метро «Магілёўская». Прыкладна на дзве хвіліны быў затрыманы на гэтай жа станцыі і электрацягнік, які рухаўся ў супрацьлеглым напрамку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Абзац

◢ **Споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння генерал-маёра, Героя Савецкага Саюза Аляксандра Лізюкова, ураджэнца Гомеля. Званне Героя ён атрымаў за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях пад Барысавам і Смаленскам. Камандаваў танкавай арміяй, загінуў у баі летам 1942 г.**

◢ На памежным пасту «Гудагай» Ашмянскай мытні ў грамадзяніна Беларусі, які ехаў цягнікам Мінск — Вільнюс, канфіскаваная валюта. У дэкларацыі ён указаў, што перавозіць 3 тыс. еўра, аднак пры даглядзе сумкі было знойдзена яшчэ 13450 еўра і $200, якія былі схаваныя ў асабістых рэчах. Незадэклараваная валюта канфіскаваная.

◢ **Былы дырэктар аднаго з прадпрыемстваў Вілейскага раёна асуджаны за крадзеж каля Br159 млн. У 2006 г. ён без спецыяльнай ліцэнзіі вёў закуп металалому ў насельніцтва. У выніку здаў на перапрацоўку больш за 572,5 т сыравіны, што дазволіла атрымаць даход у асабліва буйным памеры. Акрамя гэтага, дырэктар рабіў махінацыі з таварна-транспартнымі накладнымі, што дало магчымасць прысвоіць істотную суму. Суд прыгаварыў яго да 8 гадоў пазбаўлення волі. Прысуд уступіў у законную сілу, паведамляе БЕЛТА.**

◢ Былы начальнік УУС Гродзенскага аблвыканкама генерал-маёр Генадзь Хацько пакуль не знойдзены, паведаміў БЕЛТА міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў, які ўчора ў Гродне вёў прыём па асабістых пытаннях. Як вядома, у дачыненні да Г. Хацько заведзена крымінальная справа па падазрэнні ў злоўжыванні ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі. Ён аб'яўлены ў вышук пасля звароту яго родных у органы ўнутраных спраў у сувязі з яго знікненнем. Анатоль Куляшоў паведаміў, што праводзяцца ўсе неабходныя мерапрыемствы па вышуку асобы, якая ўхіляецца ад следства.

◢ **Доступ да сайтаў дзвюх вядучых брытанскіх газет «Таймс» і «Сандзі таймс» з чэрвеня стане платным. Чытачам сайтаў давядзецца заплаціць паўтара долара ў дзень альбо 3 долары за тыднёвую падпіску. Выдавец, кіраўнік медыя-імперыі Руперт Мердак, называе кошт цалкам прымальным, аднак іншыя гульцы рынку лічаць, што такім чынам кампанія пазбавіцца тысяч чытачоў.**

## Поўны абзац

◢ Мужчына прыкаваў сябе да дзвярэй пашпартнага стала дзеля паездкі на вяселле брата. Ірландскі ландшафтны дызайнер быў вымушаны пайсці на крайнія меры, каб трапіць на вяселле свайго брата ў Тайландзе. Ён прыкаваў сябе веласіпедным ланцугом да дзвярэй пашпартнага стала, пакуль не атрымаў гарантый таго, што яго дакументы будуць гатовыя да адлёту на свята. Хваляванні жыхара Дубліна былі звязаныя з забастоўкай працаўнікоў пашпартнага стала. 38-гадовы мужчына ўзброіўся трыма паліто, тэрмасам гарбаты, бутэрбродамі, радыё, кнігамі і ліхтарыкам, што дапамагло яму пратрымацца больш за 10 гадзін на марозе. Затым паліцыя прыгразіла яму арыштам за парушэнне грамадскага парадку, аднак гарантыі ён усё ж атрымаў.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# Падпаліў жонку

**Калі жыхарка в. Зорнае (Баранавіцкі раён) вярнулася з начнога дзяжурства дамоў, на парозе кватэры яе сустрэў муж з бензінам і запалкамі. Мужчына лінуў на жонку бензін і шарګануў запалкай.**

Ахопленая агнём жанчына кінулася на вуліцу. На крыкі пацярпелай выбеглі суседзі і пачалі збіваць полымя. Тут жа выклікалі «хуткую дапамогу» і міліцыю. Падпальшчыка затрымалі непадалёк ад дома. Высветлілася, што 25 сакавіка мужчына павінен быў быць на пасяджэнні суда ў якасці абвінавачанага. Паўтара месяца таму ён ужо нападаў на жонку і моцна парэзаў яе. Пацярпелая знаходзіцца ў бальніцы з апёкамі твару, рук і ног.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Ахвярай паводкі стаў мост

У вёсцы Парэ Пінскага раёна ледзяная глыба пашкодзіла драўляны мост. Супрацоўнікі Пінскага рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння (РАСП) двойчы ўзрывалі лёд на рацэ Простыр. Але аграмадная льдзіна прыплыла па вадзе і ўдарылася ў апору моста. Мост не вытрымаў. І цяпер па нахіленым да самай вады мосце яшчэ можна прайсці пехатою, а вось падвода ўжо не пройдзе. Вёска фактычна аказалася падзеленай на дзве часткі. Паводле інфармацыі абласнога ўпраўлення МНС, у найбліжэйшы час мост адрамантуюць супрацоўнікі згаданага РАСП.

**Яна СВЕТАВА.**

УНН 100251588

## ОАО «МИНСККОНТРАКТ»

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 г.** млн руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| **Внеоборотные активы** | **12021** | **Капитал и резервы** | **16040** |
| в т. ч.: | | в т. ч.: | |
| Основные средства | 8334 | Уставный фонд | 8063 |
| Нематериальные активы | 2 | Собственные акции, выкупленные у акционеров | 37 |
| Вложения во внеоборотные активы | 3685 | | |
| **Оборотные активы** | **9698** | Резервный фонд | 45 |
| в т.ч.: | | Добавочный фонд | 2916 |
| Запасы и затраты | 1610 | Нераспределенная (неиспользованная) прибыль | 1599 |
| в т. ч. готовая продукция и товары для реализации | 1350 | Целевое финансирование | 3454 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 647 | Долгосрочные обязательства | 0 |
| | | Краткосрочные обязательства | 5679 |
| Дебиторская задолженность | 3630 | Краткосрочные кредиты и займы | 0 |
| Финансовые вложения | 211 | | |
| Денежные средства | 3600 | Кредиторская задолженность | 5679 |
| **БАЛАНС** | **21719** | **БАЛАНС** | **21719** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г.**

| Наименование показателей | млн руб. |
|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 42206 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 6426 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 35780 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 29889 |
| Расходы на реализацию | 3921 |
| **Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | **1970** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | |
| Операционные доходы | 3611 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 483 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 3128 |
| в том числе: проценты к получению | 337 |
| доходы от операций с активами | 2677 |
| доходы от участия в создании других организаций | - |
| прочие операционные доходы | 114 |
| Операционные расходы | 1802 |
| в том числе: расходы от операций с активами | 1688 |
| прочие операционные расходы | 114 |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов** | **1326** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | |
| Внереализационные доходы | 149 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 6 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 143 |
| Внереализационные расходы | 542 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов** | **-399** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) за отчетный период** | **2897** |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 789 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (убыток)** | **2108** |
| Справочно: | |
| Сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 766 |

**Пункты 5–10 формы № 1**
**«Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности»**

5. Количество акционеров, всего – 395, в том числе: юридических лиц – 1, физических лиц – 394.

**6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 40,7 | 7,0 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 203,0 | 34,70 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тысяч рублей | 62,25 | 50,04 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 930 | 930 |

**7. Информация о задолженности**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | - | - |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | - | - |

9. Среднесписочная численность работающих (человек) 110.
10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **оптовая торговля.**

**Генеральный директор** **В.Л. Плавский**
**Главный бухгалтер** **И.С. Шавель**

Организация: **ОАО «БЕРЕЗОВСКИЙ КСИ»**

Учетный номер плательщика: **200022939**
Вид деятельности: **производство стеновых блоков**
Организационно-правовая форма: **частная**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **Брестская обл., г. Береза**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 г.**

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 38 370 | 116 191 |
| амортизация | 102 | 23 046 | 17 410 |
| остаточная стоимость | 110 | 15 324 | 98 782 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 36 | 36 |
| амортизация | 112 | 8 | 14 |
| остаточная стоимость | 120 | 28 | 22 |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | - | - |
| амортизация | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | 130 | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 23 402 | 21 857 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 20 759 | 17 769 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **38 754** | **120 660** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 5 586 | 16 086 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 1 745 | 15 354 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более, чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 5 344 | 1 392 |
| Расчеты с учредителями | 250 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 105 | 1 149 |
| Финансовые вложения | 270 | 17 | 17 |
| Прочие оборотные активы | 280 | 55 | 55 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **12 852** | **34 053** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **51 606** | **154 713** |
| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 323 | 31 735 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | - |
| Резервный фонд | 420 | 86 | 86 |
| Добавочный фонд | 430 | 20 583 | 1 703 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 3 411 | - 4 298 |
| Целевое финансирование | 460 | 103 | - |
| Доходы будущих периодов | 470 | - | - |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 24 506 | 29 226 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 14 197 | 38 818 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | 1 689 | 70 047 |
| **ИТОГО по разделу IV** | 590 | 15 886 | 108 865 |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 1 034 | 10 860 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 10 180 | 5 762 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **11 214** | **16 622** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **51 606** | **154 713** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г.**

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 25 841 | 46 391 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции,работ, услуг | 011 | 3 923 | 7 401 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 21 918 | 38 990 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 24 351 | 29 002 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | -2 433 | 9 988 |
| Управленческие расходы | 050 | - | - |
| Расходы на реализацию | 060 | 1 902 | 2 742 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **-4 335** | **7 246** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 12 646 | 7 482 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 33 | 22 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 12 613 | 7 460 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | 1 | 51 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | - |
| доходы от операций с активами | 093 | 1 238 | 187 |
| прочие операционные доходы | 099 | 11 374 | 7 222 |
| Операционные расходы | 100 | 12 615 | 7 492 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | 1 287 | 234 |
| прочие операционные расходы | 109 | 11 328 | 7 258 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **- 2** | **- 32** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 1 193 | 242 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 7 | 1 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 1 186 | 241 |
| Внереализационные расходы | 150 | 1 198 | 2 200 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **- 12** | **- 1 959** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **- 4 349** | **5 255** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 480 | 444 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | 3 | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **- 3 872** | **5 699** |
| Налог на прибыль | 250 | - | 1 326 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 303 | 367 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 1 | 39 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **- 4 653** | **3 523** |

**5-9. Информация о дивидендах и акциях, количестве акционеров, задолженности**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 432 | 432 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 431 | 431 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 0,00 | 0,00 |
**Захапленні:** аддае перавагу актыўнаму адпачынку. «Ні хвіліны спакою» — гэта менавіта пра яе. І як сапраўдная «лэдзі», безумоўна, вельмі любіць хадзіць па крамах.

**Калегі пра яе:** Алена — ад стар. грэч. «факел», «абраная», «светлая», «якая ззяе» — і гэта ўсё сапраўды пра яе. Сваёй жыццярадаснасцю яна «зараджае» нават калі за акном дрэннае надвор'е і праблемы не даюць спакою. Мужчыны захапляюцца ёю, а жанчыны белай зайздрасцю зайздросцяць яе натуральнасці, добразычлівасці і эмацыйнасці.

## МАЛІКАВА Валянціна Мікалаеўна



Старшы інспектар аддзела аховы аб'ектаў і фізічных асобаў упраўлення Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў. У 1996 г. закончыла філалагічны факультэт БДУ. Да прыходу ў АУС працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры. За 10 гадоў службы ў ахове зарэкамендавала сябе адукаваным і выканаўчым супрацоўнікам.

**Захапленні:** вельмі любіць чытаць — усе шафы ў яе кватэры проста ломяцца ад рознай літаратуры. Карысці ад прачытаных кніг заўсёды вельмі шмат: любіць падарожнічаць па маляўнічых мясцінах нашай краіны. Са сваімі сябрамі Валянціне ўдалося пабываць практычна ва ўсіх кутках Беларусі, і амаль заўсёды яна выконвае ролю гіда.

**Калегі пра яе:** у адзін голас адзначаюць яе прафесіяналізм, эрудыцыю і неперасягнутае пачуццё гумару. «Проста дзівімся, калі ж яна ўсё паспявае: адказная праца, дом, дзеці, а яна заўсёды вясёлая і прыгожая — праменьчык святла ў нашым мужчынскім «царстве». (Валянціна адзіная жанчына ў аддзеле з 11 чалавек).

## МАРОЗАВА Маргарыта Віктараўна

Старшы інспектар па асобых даручэннях арганізацыйна-кантрольнага ўпраўлення Дэпартамента аховы, падпалкоўнік міліцыі. У 1997 годзе закончыла Акадэмію міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Міліцэйскую кар'еру пачала з пасады оперупаўнаважанага УУС на транспарце МУС Беларусі. У ахове — з 1994 года. Удзельнік баявых дзеянняў на тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан з лістапада 1986 па студзень 1989 года.

**Захапленні:** любіць прымаць гасцей, захапляецца спортам. У вольны час займаецца развядзеннем кветак — цыкламенаў.

**Калегі пра яе:** аматар анекдотаў, у асаблівасці з украінскім каларытам. На яе заўсёды можна палажыцца, даверыцца як сапраўднаму сябру. Увасабляе сабой патомнага ахоўніка-целаахоўніка.



## ЧАРАПКО Жанна Іосіфаўна



Капітан міліцыі аддала аддзелу камплектавання больш за 7 гадоў. Закончыўшы Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, яна некаторы час прапрацавала ў дзіцячым садку. Сёння Жанна Іосіфаўна — старшы інспектар аддзела кадраў Брэсцкага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы.

Жанна Іосіфаўна з тых, каго называюць працаголікамі. Ніколі не ўзнікае прычыны, па якой яна магла б адмяніць запланаваную кансультацыю з кандыдатамі на службу або кадравікамі з падраздзяленняў, на якой разглядаюцца надзённыя праблемы. «Жанна Чарапко — душа ўсяго аддзела кадраў і ініцыятар шматлікіх добрых спраў», — так пра яе гавораць калегі. Акрамя сваіх прафесійных якасцяў, яна добрая жонка і мама дваіх дзяцей. Гармонія ў асабістым жыцці станоўча адбіваецца і на працоўным настроі. Жанна з мужам, таксама афіцэрам, як нітачка з іголачкай дапаўняюць адно аднаго.

У 2008 годзе Жанна заняла першае месца па выніках конкурсу «Лепшы па прафесіі» ў намінацыі «лепшы кадравік», а нядаўна была ўзнагароджана нагрудным знакам Дэпартамента аховы «За адзнаку».

**У Дэпартаменце аховы МУС Рэспублікі Беларусь і яе аддзелах служыць яшчэ шмат прыгожых дзяўчат у пагонах. Працяг тэмы жаночай абаяльнасці і прыгажосці ў наступным нумары. Вясна ж працягваецца!**

**Над спецвыпускам працавалі:**
**У. ЗДАНОВІЧ, А. ГЕРАСІМАЎ, Ю. АКСЮЧЫЦ, А. ЯРМАЛІНСКАЯ, А. НОВІК, А. ПУШНОВА, В. ЛУК'ЯНАЎ, О. КІПЧАНКА, А. ЧАРНЯЎСКІ, А. САЛЯНЮК.**

## У суседзяў

### НЕЗАДАВОЛЕНАСЦЬ НА ЗАХОДНІМ АВАНПОСЦЕ

**У Калінінградзе цяжка ўявіць, што гэта стараданы нямецкі горад, але мясцовыя жыхары ўсё адно імкнуцца ў Еўропу, піша THE NEW YORK TIMES. «Я жадаў бы вярнуць Кенігсберг у Еўропу. Крамля ў маёй галаве няма», — заявіў мясцовы блогер і палітычны актывіст Рустам Васільеў.**

«Людзі накшталт Васільева трывожаць Крэмль, паколькі ў Калінінградзе адбыліся адны з самых буйных у Расіі антыўрадавых дэманстрацый за апошнія гады, часткова таму, што чыноўнікам не ўдаецца наблізіць рэгіён да заходнееўрапейскага ўзроўню», — піша газета.

Калі калінінградцы гавораць пра Расію, яны часта маюць на ўвазе не ўласны рэгіён, а нейкую чужую краіну на ўсходзе, сцвярджае аўтар. У Калінінградскай вобласці «ёсць незалежныя тэлеканалы, у мясцовым заканадаўчым сходзе засядаюць сапраўдныя апазіцыянеры, хоць іх уплыў мінімальны. Дробныя вулічныя дэманстрацыі — звычайная справа, і ўлады з імі звычайна мірацца». І ўсё ж студзеньская 10-тысячная дэманстрацыя з патрабаваннямі адстаўкі губернатара відавочна заспела і Маскву, і ўлады Калінінграда знянацку, піша газета.

### ДАРАГАЯ ПАМЫЛКА ПУЦІНА

**Пры дапамозе бюджэтных мільярдаў расійскі прэм'ер-міністр жадае падоўжыць жыццё стратным заводам і фабрыкам, каб забяспечыць працоўныя месцы суграмадзянам, а палітычную будучыню — сабе, піша HANDELSBLATT.**

Лёс амаль кожнай сям'і, якая пражывае ў расійскім Байкальску, размешчаным на паўднёвым беразе возера Байкал, злучаны з Байкальскім цэлюлозна-папяровым камбінатам. Штогод страты БЦПК складалі каля 10 млн еўра, доўгі час ён быў закрыты — у тым ліку і таму, што быў не ў стане закупіць дарагое ачышчальнае абсталяванне. Але неўзабаве прадпрыемства адновіць сваю працу, піша аўтар артыкула.

Расійскі прэм'ер, працягвае журналіст, раз'язджае па краіне і ратуе прадпрыемствы, «якія загінаюцца», нягледзячы на тое, што ў большасці выпадкаў гэта не мае сэнсу ні ў эканамічным, ні ў экалагічным плане. «Ён проста павінен гэта рабіць. Пуцін знаходзіцца пад наймацнейшым ціскам з часу свайго прыходу на ўладу». Крызіс балюча ўдарыў па эканоміцы краіны, многія баяцца за сваю будучыню, а за эканамічную палітыку традыцыйна прызнаецца адказным менавіта кіраўнік урада. Упершыню ў акцыях пратэсту загучалі лозунгі з патрабаваннямі адстаўкі Пуціна. Расіянам даводзіцца расхлёбваць хібную эканамічную палітыку свайго кіраўніцтва, канстатуе аўтар.

### СУСЕДКА, ПРАЎДА НЕ ТВАЯ!

**Камітэт па Яднанні польскіх арганізацый у Беларусі ў справе канфлікту вакол Саюза палякаў вітае дзеянні міністра замежных спраў Рэспублікі Польшча Радаслава Сікорскага, накіраваныя на ўрэгуляванне сітуацыі шляхам канструктыўнага дыялогу з уладамі Беларусі.**

Разам з тым, на думку прадстаўнікоў Камітэта, улады РП на падставе недастаковернай інфармацыі прынялі шэраг памылковых і шкодных рашэнняў, якія датычацца польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі. Нагодай гэтаму паслужыла кампанія маны пра быццам бы прыцісканні правоў суайчыннікаў, якую з 2005 года праводзіць група на чале з Анжэлікай Борыс. «На нашу думку, улады і СМІ ў Рэспубліцы Польшча знаходзяцца пад уплывам прапаганды групы, якая ўзурпіравала права тытула «Саюз палякаў на Беларусі» і якая не мае права прадстаўляць мільённую дыяспару палякаў у гэтай краіне».

### БЫЛАЯ МОЦ РАСІЙСКАЙ НАВУКІ І ТЭХНІКІ ІДЗЕ НА СПАД

**Былая моц расійскай навукі ідзе ўніз па нахільнай, як і спартыўнае майстэрства савецкай эпохі, піша THE CHRISTIAN SCIENCE MONITOR. Недахоп сродкаў і грамадскага прызнання прыводзіць да таго, што нямногія з маладых людзей выбіраюць для сябе навуковую кар'еру, адзначае аўтар артыкула.**

Расійскае дзяржаўнае фінансаванне навукі вырасла ў 2008 годзе, калі цяперашні прэм'ер-міністр Уладзімір Пуцін быў прэзідэнтам, прыкладна да 2 млрд, што стала рэкордам постсавецкай эпохі, але пасля гэтага зноў панізілася да 1 млрд. Гэта ўсяго 2% таго, што ўрад Злучаных Штатаў выдаткоўвае штогод на падтрыманне навуковай працы ў сваёй краіне, скардзіцца віцэ-прэзідэнт Расійскай акадэміі навук Генадзь Месяц у інтэрв'ю, апублікаваным на сайце акадэміі.

«Справа не толькі ў грошах, але і ў матывацыі», — сцвярджае Андрэй Іонін, навуковец, які працуе ў індустрыі касмічных тэхналогій. — Прафесія навукоўца больш не з'яўляецца прэстыжнай, і ўрад не выпучае навуковых задач, якія б прыцягнулі здольных людзей».

«Грошы маюць значэнне, — працягвае ён. — Але сацыяльнае прызнанне — таксама вельмі важны фактар у выбары кар'еры. А гэтага бракуе ў нашы дні».

### У РАСІЙСКІХ МУЗЕЯХ ВЫСТАЎЛЕНЫ НА ЎСЕАГУЛЬНЫ АГЛЯД... СТРАХ, ШТО ЭКСПАНАТЫ ЗНІКЛІ

**Пасля крадзяжу сотняў экспанатаў з Эрмітажа Пуцін распарадзіўся правесці агульнанацыянальную інвентарызацыю музеяў, піша THE LOS ANGELES TIMES. «Хутка трэба будзе прадставіць вынікі праверкі, а чыноўнікі імкнуцца мінімізаваць маштаб высноў», — сцвярджае журналіст. Міністэрства культуры РФ ужо прызнала, што знікла прыкладна 87 тыс. экспанатаў, у тым ліку некалькі сотняў з Эрмітажа.**

Чыноўнікі запэўніваюць, што сярод страчаў шмат малакаштоўных рэчаў. «Але ў Расіі, дзе скептыкі прызвычаіліся не ўспрымаць запэўненні ўлад, некаторыя незалежныя асцерагаюцца, што справаздача толькі часткова агаліць праблемы ў музеях. Тым часам міжнародныя эксперты па пытаннях мастацтва здзіўляюцца таму, як хутка быў праведзены аўдыт», — гаворыцца ў артыкуле.

# Чыноўнікаў завялі на экскурсію ў СЛЕДЧЫ ІЗАЛЯТАР

Рэпартаж з-за калючага дроту

**З прапановай ладзіць экскурсіі ў турмах для службовых асобаў, якія працуюць у найбольш карумпаваных галінах, не раз выступаў генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч. За словам — справа не стала. У сакавіку прайшло ажно тры незвычайныя экскурсіі для службовых асобаў: дзве ў Гродне, адна ў Мінску. На апошняй з іх прысутнічала і карэспандэнт «Звязды» Надзея ДРЫЛА.**

Ля СІЗА № 1, што на вуліцы Валадарскага ў Мінску, больш за 20 чалавек. На тварах спецыялістаў па ахове працы ўсмешкі, з вуснаў час ад часу злятаюць фразы накшталт «каму раскажу, дзе быў на экскурсіі, крый Божа, не павераць».

У 9.00 у паветры раздаецца каманды голас начальніка следчага ізалятара Сяргея КРАЎЧАНКІ.

— Усе падыходзім да мяне. Адключыце мабільныя тэлефоны, у каго ёсць вострыя прадметы, здайце. Я не прафесійны «гід», але пакажу вам, як жывецца за калючым дротам. Ідзіце за мной, нікуды без дазволу не зазірайце і пастарайцеся не адставаць. Трапіць да нас проста, а вось выйсці назад...

Жарт Сяргея Краўчанкі ні ў кога ўсмешкі не выклікаў. І нядзіўна, усе ж разумеюць, што ў кожным жарце ёсць доля праўды.

Прайшоўшы праз некалькі змрочных вузкіх калідораў, трапілі ў калідор з кабінетамі, сталы і крэслы ў якім былі прыкручаныя да падлогі.

— Тут праходзяць сустрэчы адвакатаў і следчых са спецкантынгентам, — тлумачыць начальнік ізалятара.

Экскурсанты моўчкі спешна крочылі за «гідам».

Найбольшую цікавасць выклікалі, як вы здагадваецеся, камеры з арыштаванымі. Каб паглядзець у «вочка», ля масіўных дзвярэй з цяжкімі затворамі выстраіліся доўгія чэргі. Адной з апошніх зазірнула і я. Бітком набітыя мужчынамі, маладымі і не вельмі, невялікія памяшканні, ложкі ў два ярусы, паміж якімі вузкія праходы, цёмныя сцены. Нечакана для ўсіх нас начальнік СІЗА прапанаваў зайсці ў адну з камер. Усе адступілі на крок назад. Чамусьці ніхто не адважваўся стаць «першапраходцам». Я вырашыла ўзяць «удар» на сябе і зрабіла крок наперад. Шчыра прызнацца, разгубілася, бо не чакала сустрэць больш за 10 пар вачэй, накіраваных на няпрошаную госцю. Усё, што я паспела заўважыць, дык гэта доўгі стол, уздоўж якога і выстраіліся падследныя, газету і нарды. Рэзка развярнулася і выйшла з камеры. У той момант у мяне, як думаю, і ва ўсіх экскурсантаў, з'явілася адзінае жаданне — хутчэй выйсці на волю, зірнуць на неба і ўдыхнуць вольнае паветра.

Падобныя экскурсіі, лічаць у Генпракуратуры, адна з новых формаў прафілактыкі карупцыйных злачынстваў у краіне. Наколькі эфектыўная, пакажа час...

**Да слова.** Аўтарытэтна пра электронныя бранзалеты

Юрый ГАРОШКА, начальнік аддзела па наглядзе за законнасцю выканання крымінальных пакаранняў Генпракуратуры Беларусі:

**— Электронныя сродкі кантролю за асуджанымі прымяняе сёння Польшча, Швецыя, Расія. Нашай саюзнай дзяржаве на гэтыя мэты Еўрасаюз выдзеліў 3 мільёны еўра. Бранзалеты, не сакрэт, дастаткова нятанная рэч. Але, тым не менш, пытанне не стаіць на месцы. Пошукам інвестара зараз сур'ёзна займаецца Генпракуратура Беларусі сумесна з УУС Мінгарвыканкама. Мяркую, што праз год-два і ў нас з'явіцца нешта падобнае. Ідэя выкарыстання электронных сродкаў кантролю за асуджанымі вельмі добрая і гуманная. Я думаю, кожны падследны хацеў бы чакаць суда дома, хоць і пад кругласутачным наглядам, з бранзалетам на руцэ, чым за агароджай з калючым дротам. Ды і гэта была б пэўная эканомія. Бо сёння на ўтрыманне аднаго зняволенага ў месяц затрачваецца ў сярэднім 250 тысяч рублёў. Поўнае ж месячнае ўтрыманне непаўнагадовага ў месцах пазбаўлення волі абыходзіцца дзяржаве ў паўтара мільёна рублёў.**

Сяргей КРАЎЧАНКА, начальнік СІЗА № 1 Мінска:

### «ТУРМА НІКОЛІ НЕ БЫЛА І НЕ БУДЗЕ ЦУКРАМ»

— Кожны нармальны чалавек, наведаўшы калонію ці следчы ізалятар у якасці экскурсанта, не захоча сюды вярнуцца ў іншай якасці. Іншымі словамі, наведванне падобнай установы прымушае задумацца. І ў гэтым плане экскурсія, безумоўна, карысная.

Ігар ГРЭЙБО, начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генпракуратуры Беларусі:

### «КАБ ПАГЛЯДЗЕЛІ І РАСКАЗАЛІ ІНШЫМ»

— Штогод у краіне выяўляецца каля трох тысяч карупцыйных злачынстваў. Да крымінальнай адказнасці (а ў нашай краіне за карупцыйнае злачынства, як правіла, прызначаецца пакаранне, звязанае з пазбаўленнем волі) прыцягваецца каля 1000 службовых асобаў. Самымі «нячыстымі на руку» галінамі з'яўляюцца гандаль, сельская гаспадарка, будаўніцтва, прамысловасць і сістэма дзяржкіравання. Да слова, у сферы сельскай гаспадаркі і харчавання здзяйсняецца каля 400 карупцыйных злачынстваў, яна па карумпаванасці знаходзіцца на другім месцы пасля гандлю. Падобныя мерапрыемствы, разлічваем, дапамогуць у барацьбе з карупцыяй. Мне здаецца, што чыноўнік пасля наведвання турмы, магчыма, не адважыцца пайсці на службовае злачынства. І яшчэ. Мы ні ў якім разе не хочам нікога пакрыўдзіць, запрашаючы на падобную экскурсію. Для нас важна, каб людзі паглядзелі, як не соладка тут жывецца, і расказалі іншым. Такія экскурсіі плануем праводзіць і надалей.

Галіна НАЛІВАЙКА, дацэнт Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў АПК БДАТУ, куратар групы:

### «УСІХ ПАГАЛОЎНА НА ЭКСКУРСІЮ Ў ТУРМУ ВАДЗІЦЬ НЕ ТРЭБА»

— Да нас пастаянна прыязджаюць павышаць кваліфікацыю спецыялісты аграпрамысловага комплексу з усіх рэгіёнаў краіны. На экзатычную прапанову Генпракуратуры наведаць следчы ізалятар мы адгукнуліся адразу ж. Я не думаю, што на экскурсію ў турму вадзіць трэба ўсіх пагалоўна. Кагосьці можна звадзіць, а астатнім расказаць праз СМІ. Для гэтага ж вас (звяртаецца да мяне. — Н.Д.) сюды і запрасілі.

**Дарэчы.** Расійскія турфірмы ладзяць экскурсіі ў знакамітую турму «Уладзімірскі цэнтрал». Турысты заязджаюць ізалявана адзін ад аднаго на спецаўтобусе для зняволеных. Пасля гэтага пераапранаюцца ў турэмныя робы, у іх здымаюць адбіткі пальцаў і фатаграфуюць з нумарамі. Затым экскурсантаў чакаюць камеры (мужчыны асобна ад жанчын), абед у турэмнай сталовай і, нарэшце, доўгачаканае «вызваленне».

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

**ОАО «ПУХОВИЧИНЕФТЕПРОДУКТ»**

УНН 600125012

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

Единица измерения: млн руб.

| АКТИВ | Коды строк | На начало года | На конец года |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 14576 | 21309 |
| Нематериальные активы | 120 | 4 | 10 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | 349 | 310 |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 2230 | 236 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 2085 | 210 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | 0 | 0 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **17159** | **21865** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 3856 | 6042 |
| Налоги по приобретенным активам | 220 | 42 | 11 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | 79 | 71 |
| в том числе: прочая дебиторская задолженность | 232 | 79 | 71 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 1654 | 1160 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 359 | 620 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 668 | 15 |
| по налогам и сборам | 243 | 621 | 510 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 5 | 0 |
| разных дебиторов | 245 | 1 | 15 |
| Денежные средства | 260 | 562 | 317 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **6193** | **7601** |
| **БАЛАНС** | **300** | **23352** | **29466** |
| **ПАССИВ** | | | |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 537 | 537 |
| Резервный фонд | 420 | 34 | 43 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | 34 | 43 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 0 | 0 |
| Добавочный фонд | 430 | 17460 | 23012 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 1559 | 120 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **19590** | **23712** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **590** | **0** | **0** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 940 | 800 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 2822 | 4954 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 1869 | 3950 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 764 | 671 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 69 | 111 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | 1 | 0 |
| по налогам и сборам | 625 | 44 | 137 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 30 | 41 |
| перед прочими кредиторами | 628 | 45 | 44 |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | 0 | 0 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | 0 | 0 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **3762** | **5754** |
| **БАЛАНС** | **700** | **23352** | **29466** |

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2009 г. по 31 декабря 2009 г.

ОАО «Пуховичинефтепродукт»

Единица измерения: млн руб.

| Наименование показателей | Код строк | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 109153 | 107872 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 16754 | 16549 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 92399 | 91323 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 81890 | 81820 |
| в том числе: покупная стоимость товаров без НДС | 031 | 81890 | 81820 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 10509 | 9503 |
| Расходы на реализацию | 060 | 6468 | 4915 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-060)** | **070** | **4041** | **4588** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 119 | 138 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 17 | 19 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 102 | 119 |
| в том числе: | | | |
| проценты к получению | 091 | 12 | 16 |
| доходы от операций с активами | 093 | 90 | 103 |
| Операционные расходы | 100 | 238 | 130 |
| В том числе: расходы от операций с активами | 102 | 233 | 129 |
| прочие операционные расходы | 109 | 5 | 1 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | -136 | -11 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 394 | 107 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 0 | 1 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 394 | 106 |
| Внереализационные расходы | 150 | 317 | 731 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **77** | **-625** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160)** | **200** | **3982** | **3952** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 378 | 473 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+210)** | **240** | **4360** | **4425** |
| Налог на прибыль | 250 | 465 | 485 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 267 | 212 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (200-250-260)** | **300** | **3250** | **3255** |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | 2200 | 2244 |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | 60500 | 60593 |

**Информация о дивидендах**

| Наименование показателей | 2009 год |
|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов, млн руб. | 0 |
| Дивиденды на одну акцию, руб. | 0 |
| Количество акционеров, всего лиц | 91 |
| в том числе: | |
| Юридических лиц | 1 |
| Физических лиц | 90 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества, тыс. руб. | 441408 |

Ігар БАРЫСЕНКА:

28 сакавіка — Дзень работніка бытавога абслугоўвання насельніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі

# «Вядомы выраз «важней за ўсё пагода ў доме» ў вялікай ступені адносіцца да нас, камунальнікаў»

**Знаёмім з суразмоўцам**

**УРАДЖЭНЕЦ Хойніцкага раёна. Закончыў прафтэхвучылішча ў Мінску і Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Крупскай. Бакалаўр. Працоўная біяграфія насычана разнастайнасцю займаемых пасад: слесар Мінскай кандытарскай фабрыкі «Камунарка», лабарант Палескага саўгаса-тэхнікума (г. Калінкавічы), майстар вытворчага навучання Мазырскага палітэхнікума, начальнік майстэрняў, начальнік аддзела эксплуатацыі, намеснік дырэктара па эксплуатацыі і перавозках Калінкавіцкага міжраённага аўтатранспартнага прадпрыемства і г.д.**



Уменне ладзіць з людзьмі, мэтанакіраванасць, энтузіязм, высокае прафесійнае майстэрства былі заўважаны і ацэнены кіраўнікамі ўладных структур, таму Ігару Анатольевічу даручылі ўзначальваць у Калінкавічах у розны час КУП «Гарцепласетка», аўтабазу райпа. Пасля ён працаваў галоўным інжынерам «Мазырскага камунальніка», намеснікам генеральнага дырэктара «Камунальніка Калінкавіцкага», дырэктарам даччынага прадпрыемства «Прыбой» гэтай жа ўстановы. На пасадзе генеральнага дырэктара «Камунальнік Калінкавіцкі» з 2008 года.

***— Ігар Анатольевіч, напэўна, усім вядомы такі выраз: «важней за ўсё пагода ў доме». Яго можна разумець як у прамым, так і пераносным сэнсе. Мяркую, што гэтыя словы ў вялікай ступені адносяцца да работнікаў жыллёва-камунальных службаў, да якіх належыць і ваш калектыў. Ці згодны са сказаным?***

— Яшчэ б. На мой (ды і не толькі мой) погляд, здаецца, што работа камунальнікаў найбольш за іншых арганізацый набліжана да чалавека. Уявіце сабе, што, напрыклад, наша прадпрыемства з'яўляецца шматгаліновым комплексам, які ўключае ў сябе паслугі па жыллёвай гаспадарцы, цепла- і водазабеспячэнні, водаадвядзенні, санітарнай ачыстцы населеных пунктаў і тэрыторый. Мы займаемся добраўпарадкаваннем паркаў, сквераў, вуліц, могілак. На нашым балансе гасцініцы, лазні. У нас ёсць энерга- і дарожна-будаўнічы ўчастак, асфальтабетонны завод. Мы вырабляем і рэалізоўваем тратуарную плітку, бардзюрны камень і г.д. Як бачна, спектр нашых паслуг насельніцтву даволі шырокі, і ад таго, на якім узроўні яны аказваюцца, і залежыць, як вы сказалі, тая пагода ў доме.

***— Мяркую, што нездарма начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алег Леанідавіч Барысенка параіў нам расказаць на старонках «Звязды» пра добрую работу вашага калектыву, які заняў другое месца сярод аналагічных прадпрыемстваў вобласці па выніках мінулага года. І яшчэ. Калінкавіцкі раён прызнаны лепшым сярод раёнаў Гомельшчыны з колькасцю насельніцтва ад 30 да 80 тысяч за названы перыяд па выніках спаборніцтва ў сацыяльна-эканамічным развіцці. Несумненна, што тут ёсць і заслуга камунальнікаў. Віншуем!***

— Калі ўжо зайшла размова пра нашы поспехі, нялішне сказаць, што ў 2004 і 2005 гадах горад Калінкавічы быў прызнаны пераможцам у рэспубліканскім аглядзе санітарнага стану і добраўпарадкавання, а ў 2008-м наша прадпрыемства было ў сваёй галіне першым у Беларусі па ўтрыманні і тэхнічным стане жыллёвага фонду, стаўшы пераможцам таксама па выніках агляду-конкурсу па добраўпарадкаванні.

***— Здабыткі «Камунальніка Калінкавіцкага» сапраўды ўражваюць, і хацелася б, Ігар Анатольевіч, даведацца, як яны дасягаюцца. Вось, напрыклад, мінулы год...***

— Хачу сказаць, што ў склад КУП «Камунальнік Калінкавіцкі» ўваходзяць галаўное прадпрыемства і даччынае «Райжылкамгас», у якіх 36 участкаў з колькасцю 1559 чалавек. Мы абслугоўваем толькі ў горадзе 282 жылыя дамы і 14 кацельняў. Працягласць цеплавых, водаправодных і каналізацыйных сетак — 126, 144 і 73 кіламетры адпаведна. Прыблізна такі ж малюнак і на раёне. Натуральна, што, як і раней, летась асноўнай нашай задачай з'яўлялася гаспадарчая дзейнасць, накіраваная на поўнае і якаснае аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву і іншым спажыўцам.



Жылы дом па вул. Савецкай, 106 пасля капітальнага рамонту.

***— Каб справіцца з гэтай і іншымі задачамі, Ігар Анатольевіч, згадзіцеся, трэба было дэталёва падрыхтавацца.***

— Усё абсалютна правільна заўважана, а арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы, якія былі ажыццёўлены, цяжка пералічыць. Перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі прайшлі 18 ІТР і 82 рабочыя, набыты аўтамабіль для перавозкі смецця, шэсць помпаў для водазабора і дзве мотакасілкі, створана дадатковае звяно па ўкладцы пліткі. Каб лепш падрыхтаваць аб'екты ў суровы асеннезімовы перыяд, у міжацяпляльным сезоне шмат чаго зрабілі па замене, капітальным і прафілактычным рамонце асноўнага і дапаможнага абсталявання 14 кацельняў і 20 цэнтральных цеплавых пунктаў, мадэрнізавалі 5,6 кіламетра цеплавых сетак з заменай на перадызаляцыйныя трубы, цалкам замянілі ўчастак цеплатрасы ад кацельні па вуліцы Геолагаў да жылога дома № 27 па вуліцы Лясной даўжынёй 1680 метраў і г.д.

Асобна ж хачу сказаць, што на балансе ў нас знаходзіцца 50 кацельняў, 39 з якіх працуюць на мясцовых відах паліва. Летась іх было выкарыстана 7860 тон умоўнага паліва. Іх і дровы мы на 80 працэнтаў нарыхтоўваем уласнымі сіламі, а 20 працэнтаў пастаўляюцца Мазырскім і Ельскім лясгасамі. У мінулым годзе ў райцэнтры па вуліцы Марата была прыбудавана кацельня з энергаэфектыўнай тэхналогіяй беларускіх вытворцаў, у тым ліку з усталяваннем двух катлаагрэгатаў Гомельскага завода «Камконт» з механічнай падачай дранкі. Яны дазваляюць выпрацоўваць на ёй цеплавую энергію з удзельным расходам да 180 кілаграмаў умоўнага паліва на адну гігакалорыю замест 200—210 кілаграмаў.

***— А што рабілася і робіцца па захаванні і бяспечнай эксплуатацыі жыллёвага фонду?***

— Штогод нашы спецыялісты вясной і восенню праводзяць агляды жылых дамоў, пасля чаго складаюцца планы іх бягучага рамонту, разлічваецца патрэбнасць у матэрыялах. У нас створана брыгада па рамонце дахаў наплаўленым рубероідам, які ў адрозненне ад ранейшага метаду дазваляе ім больш служыць. Летась, напрыклад, уласнымі сіламі такім чынам мы капітальна адрамантавалі 3,6 тысячы квадратных метраў дахаў. Работы ў гэтых напрамках будзем працягваць і сёлета.

Летась зроблены капітальны рамонт водаправоднай вежы ў Дудзічах, водаправоднай сеткі ў Каплічах, мадэрнізавана водаправодная вежа ў Сірадзе і каналізацыйныя помпавыя станцыі ў Ліпаве, Даманавічах і Дудзічах. Работ наперадзе шмат, бо ў шэрагу вёсак у пітной вадзе павышанае ўтрыманне жалеза.

***— Якія задачы на 2010 год вы выдзелілі б?***

— Усе яны важныя. Гэта і ўвод у эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту двух жылых дамоў, і мадэрнізацыя яшчэ аднаго з элементамі капітальнага рамонту, і капітальны рамонт 2,69 тысячы квадратных метраў дахаў, і далейшае выкарыстанне мясцовых відаў паліва ў кацельнях. Працягнуцца работы і па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Адным словам, задачы такія, што трэба будзе, як кажуць, напружыцца. Ды нам да гэтага не прывыкаць.

Напаследак скажу, што тыя поспехі, якіх прадпрыемства дасягнула, гэта вынік штодзённай карпатлівай працы ўсяго нашага калектыву. Я шчыра віншую вас, паважаныя калегі, з прафесійным святам і зычу ўсім моцнага здароўя, шчасця, недаўгага жадання ісці наперад. Так трымаць!

УНП 400023994,
КУП «Камунальнік Калінкавіцкі»,
вул. Суркова, 14, г. Калінкавічы,
247710, тэл./факс 3 12 66.

Рэверс з сеціва

# «У настаўнікаў — толькі адны абавязкі?...»

***(Працяг дыскусіі. Пачатак у нумарах за 17 і 25 сакавіка.)***

@

Даўно збіраўся сам напісаць. Маю педагагічны стаж больш як 30 гадоў, вышэйшая катэгорыя. Жонка таксама з такім жа педагагічным стажам. Двое дзяцей, на жаль, таксама пайшлі па гэтай сцежцы. Агульны педагагічны стаж каля 80 гадоў. І што мы маем? Сардэчныя болі, пастаянныя знявагі і больш нічога. З аўтарамі згодны, але маючы такі педагагічны стаж, магу дадаць шмат.

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

Падлічыў сваю зарплату (на стаўку) са студзеня 2010 года.

Стаўка вышэйшай катэгорыі — 288 927 (астатніх катэгорый — не ведаю).

Даплата за катэгорыю 30 % — 86 628 (для іншых катэгорый ад 0 да 20 %).

Даплата за стаж звыш 15 гадоў 30 % — 86 628 (з меншым стажам — адпаведна ніжэй).

Прэмія 20 % — 57 785 (могуць даць, а могуць і не даць).

Даплата за працу ў сельскай мясцовасці 20 % — 57 785 (у гарадах і пасёлках не даюць).

Павышэнне на 5 % — 14446,35.

За высокія дасягненні ў працы 10 % — 46 228, калі дадуць (па меркаванні адміністрацыі).

Матэрыяльная дапамога — 40 201.

Метадычная літаратура — 7500.

Такім чынам, налічана: 288927 + 86628 + 86628 + 57785 + 14446 + 46228 + 40201 + 7500 = 628343 (у выпадку выканання ўсіх інструкцый). Калі вылічыць усе падаткі, то на 600 000 ніяк не выцягну. А што казаць пра маладых спецыялістаў, якія не маюць ні стажу, ні катэгорыі і жывуць у гарадах і пасёлках? Так што, паважаны калега, верхнюю планку вы крыху завысілі.

Так, я згодны з тым, што большасць педагогаў працуе больш як на стаўку, але ж многія «сядзяць» і на голай стаўцы. Дазволена мець нагрузку да дзвюх ставак, але ўсялякая работа звыш нормы, асабліва педагагічная, гэта работа на знос. Акрамя таго, у вольны час большасць педагогаў стараюцца падзарабіць. Летам, падчас адпачынку, у калгасе на сушылцы можна зарабіць да 2 млн рублёў. Таму пра адпачынак і аздараўленне педагог і не марыць. А колькі непатрэбнай паперы педагог напіша за год, то за адзін раз не занясе.

Падтрымліваю дырэктара з Брэсцкай вобласці. Колькі можна «абдзіраць» педагога? У пачатку студзеня збіралі ўзносы на Чырвоны Крыж. Усе работнікі добраахвотна ўнеслі пэўную суму. Але калі ў канцы лютага прыслалі зноў ведамасць на збор узносаў на Чырвоны Крыж, абурэнню работнікаў не было мяжы. Паўстае пытанне, ці сапраўды мы дапамагаем хворым або дапамагаем камусьці будаваць дачу? Фонд міру, фонд выратавання на водах, фонд аховы прыроды, фонд аховы помнікаў і інш. А суботнікі? У савецкія часы таксама праводзіліся суботнікі, але там загадзя аб'яўлялі дату іх правядзення, дамаўляліся з арганізацыямі аб выдзяленні фронту работ, людзі працавалі, і заробленыя ў гэты дзень грошы пералічваліся ў фонд суботніка. А што цяпер? Мала таго, што ў гэты дзень мы працуем бясплатна, дык яшчэ і вылічваюць з нашых заробкаў сярэднюю зарплату за дзень. А з абавязковай падпіскай? Напрыканцы кожнага квартала дырэктар і завуч са слязьмі на вачах упрошваюць педагогаў выпісаць ведамасную, рэспубліканскую, абласную і раённую газеты...

Колькі слоў пра платныя паслугі. Гэта ўвогуле абсурд. Як арганізаваць платныя паслугі настаўніку, у якога ў класе два вучні, а ў вёсцы ўсе калгаснікі? Застаецца адно: зняць шапку і стаць каля царквы, а раптам назбіраеш.

Пра конкурсы метадычных распрацовак. Хто толькі іх не аб'яўляе. Пэўна, яшчэ толькі не аб'яўлялі свае конкурсы ў школе дарожнікі і дворнікі. Слабы вучань не зробіць распрацоўку, а моцныя не змогуць увесь свой час марнаваць на нікому не патрэбныя распрацоўкі, бо трэба яшчэ рыхтавацца да заняткаў і паступлення. Вось і даводзіцца самому настаўніку рабіць распрацоўку праекта, а яго аўтарамі рабіць вучняў.

Я педагог па прызванні. Памятаю школу 60-х, дзе ў адным класе сядзелі вучні па некалькі гадоў, а пасля пятага або шостага класа ішлі ў армію. Хіба дрэнныя людзі выраслі з іх? Цяпер жа, з пераходам да 10-бальнай сістэмы, у школах усе сталі паспяховымі, усе вучні да 17 гадоў маюць атэстат сталасці. Сярэдні бал па раёнах і абласцях дасягае 7,5 бала. Амаль усе выдатнікі па справаздачах. А запытайцеся вы ў гэтых выдатнікаў табліцу множання — палова не адкажа.

Літаральна на кожным кроку ўсе гавораць пра правы дзіцяці. Увялі пасады сацыяльнага педагога, псіхолага і г.д. Распрацаваны спецыяльныя праграмы па вывучэнні правоў дзіцяці, але чамусьці ні слоўца пра абавязкі вучня. Вось і атрымліваецца, што дзіця правы свае ведае вельмі добра, а абавязкаў у яго — аніякіх. Усе абавязкі дзіцяці пераклалі на настаўніка. Сапраўды, у настаўніка няма ніякіх правоў, адны толькі суцэльныя абавязкі. Прашу ў Міністэрства адукацыі (думаю, што мяне падтрымае большасць настаўнікаў), каб вярнулі «двойцы» яе ранейшую сілу і перасталі «душыць» настаўніка за сапсаваную «статыстыку». Прэстыж адукацыі можна ўзняць толькі тады, калі высокаадукаваны чалавек будзе атрымліваць значна больш, а вучань атрымае тую адзнаку, якую ён заслужыў. Тады і вучань задумаецца над тым, што без вучобы яму ў жыцці не абысціся.

**Настаўнік адной са школ Гродзенскай вобласці Дзятлаўскага раёна.**

@

Усе праблемы, узнятыя ў газеце, цалкам адпавядаюць рэчаіснасці. Неўзабаве ў школе не застанецца сапраўдных настаўнікаў. Паважанае Міністэрства, звярніце ўвагу на нашы праблемы!

**Настаўнікі Гомельшчыны.**

@

Я проста здзіўлены, што «Звязда» адважылася падняць такую балючую тэму. Гонар вам і мае сімпатыі! Буду цяпер часцей звяртаць увагу на ваша выданне. Вось менавіта праз такія дыскусіі мы можам даведацца пра рэчаісны стан спраў у нашым грамадстве. Дарэчы, я ведаю, што ў адной са школ адміністрацыя хавае нумар «Звязды» ад 17 сакавіка, каб педагогі не змаглі пабачыць разважанні настаўніка з Віцебшчыны на свае ўласныя вочы. Вось табе і галоснасць! Але ўсё роўна ў педкалектыве ідзе гарачае абмеркаванне гэтай праблемы. Трэба аб'ядноўвацца, каб Міністэрства адукацыі пачало неяк рэагаваць на выкарыстанне настаўнікаў у якасці затычак ва ўсе дзіркі.

**Ужо не настаўнік.**

**Калі вам ёсць што сказаць па праблемах школы, далучайцеся да нашай, магчыма часам занадта эмацыянальнай, рэзкаватай, але ж непрычасанай, чытацкай дыскусіі: пішыце ў рэдакцыю або пакідайце свае меркаванні на нашым сайце www.zviazda.by. Вынікі дыскусіі мы падвядзем сумесна з Міністэрствам адукацыі і галіновым прафсаюзам.**

Ёсць нагода

# Беларусь адзначыць «Гадзіну Зямлі»




**У апошнюю суботу сакавіка ў многіх краінах свету праходзіць глабальная міжнародная акцыя, ініцыяваная ў 2007 годзе Сусветным фондам дзікай прыроды (WWF) — «Гадзіна Зямлі». Сутнасць яе ў тым, што на адну гадзіну — з 20.30 да 21.30 па мясцовым часе — асобныя людзі, а таксама буйныя кампаніі і гаспадаркі выключаюць святло і адлучаюць ад сеткі лішнія электрапрыборы. Такім чынам актывісты экалагічнага руху прыцягваюць увагу да неабходнасці супрацьдзейнічаць змяненню клімату. Штогод колькасць удзельнікаў акцыі павялічваецца — калі ў 2008 годзе яе падтрымалі каля 50 мільёнаў чалавек у 35 краінах свету, то летась — ужо 74 краіны і каля 1 мільярда чалавек! Сёлета ўдзел у акцыі папярэдне пацвердзілі 1600 гарадоў са 107 краін свету, у тым ліку і Беларусі.**

Наша краіна далучыцца да «Гадзіны Зямлі» ў другі раз. Ініцыятарам правядзення акцыі ў Беларусі выступіла экалагічнае таварыства «Зялёная сетка» сумесна з Міжнародным экалагічным універсітэтам імя А.Д. Сахарава. «ВЫКлючы святло на адну гадзіну — УКЛючыся ў рух за захаванне клімату», — так у айчынным варыянце выглядае заклік «Гадзіны Зямлі-2010». «Акцыя гэта выключна сімвалічная, — мяркуе каардынатар кліматычнай праграмы «Зялёнай сеткі» Марына Багдановіч, — яе мэта не зэканоміць энергію ў пэўны дзень і гадзіну, сэнс у тым, каб людзі зразумелі значнасць энергазберажэння і «прагаласавалі» за рашучыя меры па захаванні клімату». Сёлета гэту ідэю, сцвярджаюць беларускія актывісты, падтрымалі больш як дзесяць міністэрстваў, Дзяржаўны памежны камітэт, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, гарадскія адміністрацыі Мінска, Оршы, Наваполацка, Мазыра і Светлагорска, некаторыя кампаніі і прадпрыемствы. Аператар сотавай сувязі МТС, напрыклад, абяцае адключыць у Мінску і абласных цэнтрах падсветку рэкламных канструкцый і шыльды цэнтраў абслугоўвання абанентаў, загасіць сваю падсветку Нацыянальная бібліятэка. У Маскве «адключацца» будынкі мэрыі, Лужнікі, Акадэмія навук, Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт, у Санкт-Пецярбургу — Эрмітаж, Смольны палац і некалькі мастоў. Па ўсім свеце да акцыі далучацца найбуйнейшыя гатэлі міжнароднай сеткі Hilton Worldwide.

Між тым, падобнае «галасаванне святлом» у многіх выклікае неадназначную ацэнку — напрыклад, спецыялісты па электрычнасці сцвярджаюць, што адначасовае адключэнне і падключэнне вялікай колькасці спажыўцоў выклікае рэзкае павелічэнне нагрузкі і можа стаць прычынай аварый у электрасетцы.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

«ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ»

УНП 400071112

Полн. наименование:

## Открытое акционерное общество «ИНСТИТУТ «ГОМЕЛЬПРОЕКТ»

Адрес: **246050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 30. Т/ф. 700473**
Полное ф.и.о руководителя: **Тишкевич Александр Иванович**
Полное ф.и.о гл. бухгалтера: **Колесникова Ирина Александровна**
Единица измерения: **млн руб.**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

| АКТИВ | Код стр. | На начало отчетного года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 3314 | 3977 |
| Нематериальные активы | 120 | 9 | 12 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | | |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 275 | - |
| В том числе: незавершенное строительство | 141 | | |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **3598** | **3989** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 2211 | 3520 |
| В том числе: сырье, материалы и другие активы | 211 | 219 | 234 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство и полуфабрикаты | 213 | 1681 | 2697 |
| расходы на реализацию | 214 | | |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 176 | - |
| товары отгруженные | 216 | | |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | 87 | 425 |
| расходы будущих периодов | 218 | 48 | 164 |
| прочие запасы и затраты | 219 | | |
| Налоги по приобретенным активам | 220 | 9 | 21 |
| Дебиторская задолженность | 230 | 585 | 720 |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 231 | 338 | - |
| поставщиков и подрядчиков | 232 | | |
| разных дебиторов | 233 | 131 | 567 |
| прочая дебиторская задолженность | 234 | 116 | 153 |
| Расчеты с учредителями | 240 | | |
| В том числе: по вкладам в уставный фонд | 241 | | |
| Прочие | 242 | | |
| Денежные средства | 250 | 1414 | 1880 |
| В том числе: денежные средства на депозитных счетах | 251 | | |
| Финансовые вложения | 260 | 5 | 5 |
| Прочие оборотные активы | 270 | | |
| **ИТОГО по подразделу II** | **290** | **4224** | **6146** |
| **БАЛАНС** | **300** | **7822** | **10135** |
| **ПАССИВ** | | | |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 125 | 125 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | 38 |
| Резервный фонд | 420 | | |
| В том числе: резервы, созданные в соответствии с законодательством | 421 | | |
| резервы, созданные в соответствии с учредительными документами | 422 | | |
| Добавочный фонд | 430 | 3493 | 4093 |
| Прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | | |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 991 | 1707 |
| Целевое финансирование | 460 | | |
| Доходы будущих периодов | 470 | | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **4609** | **5887** |
| **IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 520 | | |
| Кредиторская задолженность | 530 | 3213 | 4248 |
| В том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 531 | 182 | 231 |
| перед покупателями и заказчиками | 532 | 2556 | 3394 |
| по оплате труда | 533 | 246 | 329 |
| по расчетам с персоналом | 534 | | |
| по налогам и сборам | 535 | 95 | 169 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 536 | 127 | 115 |
| разных кредиторов | 537 | 7 | 10 |
| прочая кредиторская задолженность | 538 | | |
| Задолженность перед учредителями | 540 | | |
| В том числе: по выплате доходов, дивидендов | 541 | | |
| прочая | 542 | | |
| Резервы предстоящих расходов | 550 | | |
| Прочие виды обязательств | 560 | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **3213** | **4248** |
| **БАЛАНС** | **600** | **7822** | **10135** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 9236 | 7770 |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 640 | 595 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020) | 020 | 8596 | 7175 |
| Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | | |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 6764 | 6391 |
| Управленческие расходы | 040 | | |
| Расходы на реализацию | 050 | | |
| **Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)** | **060** | **1832** | **784** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 070 | 1656 | 3316 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 071 | - | - |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 080 | 1656 | 3316 |
| В том числе: От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 081 | | |
| От выбытия основных средств и нематериальных активов | 082 | 23 | 51 |
| Прочие операционные доходы | 083 | 1633 | 3265 |
| Операционные расходы | 090 | 1642 | 3309 |
| В том числе: От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование | 091 | | |
| От выбытия основных средств и нематериальных активов | 092 | 6 | 36 |
| Прочие операционные расходы | 093 | 1636 | 3273 |
| Прибыль (убыток) от совместной деятельности | 100 | | |
| Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций | 110 | | |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090±100±110)** | **120** | **14** | **7** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 254 | 20 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | - | - |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 140 | 254 | 20 |
| В том числе: От списания кредиторской задолженности | 141 | - | - |
| Курсовые и суммовые разницы | 142 | 95 | 10 |
| Безвозмездно полученные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи) | 143 | | |
| Прочие внереализационные доходы | 144 | 159 | 10 |
| Внереализационные расходы | 150 | 301 | 514 |
| В том числе: От списания дебиторской задолженности | 151 | | |
| Курсовые и суммовые разницы | 152 | 42 | 56 |
| Безвозмездно переданные активы (включая денежные средства) | 153 | | |
| Прочие внереализационные расходы | 154 | 259 | 458 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-47** | **-494** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+120+160)** | **200** | **1799** | **297** |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 210 | 527 | 141 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 316 | 82 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)** | **240** | **956** | **74** |
| Справочно (из строки 240). Сумма льготы по налогу на прибыль | | 315 | |

| | |
|---|---|
| **Данные отчетности подтверждены** *(наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)* | **Аудитор Тумарь Т.В., лицензия № 02200/0495887 выдана на основании решения МФ РБ N 68 от 06.03.09 и действительна по 21/03/2014.** |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Кол-во акционеров** | **Всего** | **56** | **В том числе:** | **Юридических лиц** | **-** | **Физических лиц** | **56** |

**Информация о дивидендах и акциях**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде** | Миллионов рублей | 125.1 | 41.7 |
| **Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)** | Рублей | 3000 | 1000 |
| **Обеспеченность акции имуществом Общества** | Тысяч рублей | 141 | 110 |
| **Количество простых акций, находящихся на балансе Общества** | Штук | 1189 | - |
| **Информация о задолженности** | | | |
| **Просроченная дебиторская задолженность** | Миллионов рублей | 381 | 289 |
| **Просроченная кредиторская задолженность** | Миллионов рублей | - | - |
| **Среднесписочная численность работающих (человек)** | | | **167** |
| **Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг** | **Проектно-изыскательские работы** | | |

**Руководитель** — **А. И. Тишкевич**

**Главный бухгалтер** — **И. А. Колесникова**

---

Организация: **ОАО «ЭКОМОЛ»**

Учетный номер плательщика: **УНП 300073213**
Вид деятельности: **производство готовых кормов для животных, содержащихся на фермах**
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **общее собрание акционеров**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **211002, п/о Заднепровское, Оршанский р-н**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 29 177 | 39 852 |
| амортизация | 102 | 13 633 | 15 200 |
| остаточная стоимость | 110 | 15 544 | 24 652 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 14 | 22 |
| амортизация | 112 | 9 | 15 |
| остаточная стоимость | 120 | 5 | 7 |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | - | - |
| амортизация | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | 130 | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 2 962 | 7 229 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 2 962 | 7 229 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **18 511** | **31 888** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 14 545 | 17 232 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 13 599 | 15 852 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | - | - |
| расходы на реализацию | 214 | - | - |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 806 | 562 |
| товары отгруженные | 216 | | - |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 140 | 818 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 3 | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | | - |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | - | - |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 17 487 | 26 014 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 14 569 | 24 467 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 1 600 | 1 024 |
| по налогам и сборам | 243 | 494 | 75 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 84 | 55 |
| разных дебиторов | 245 | 740 | 393 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | - | - |
| Расчеты с учредителями | 250 | - | - |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | - | - |
| прочие | 252 | - | - |
| Денежные средства | 260 | 1 006 | 3 038 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | 556 | 2 697 |
| Финансовые вложения | 270 | 457 | 794 |
| Прочие оборотные активы | 280 | 3 | 3 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **33 501** | **47 081** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **52 012** | **78 969** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 18 122 | 18 122 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | - | - |
| Резервный фонд | 420 | 185 | 185 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | - | - |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | 185 | 185 |
| Добавочный фонд | 430 | 6 786 | 13 381 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | - | |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 1 410 | 1 237 |
| Целевое финансирование | 460 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 470 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **26 503** | **32 925** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 11 557 | 27 927 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **11 557** | **27 927** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 3 505 | 1 893 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 10 441 | 16 217 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 9 553 | 14 451 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 285 | 208 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 186 | 210 |
| по прочим расчетом с персоналом | 624 | - | 1 |
| по налогам и сборам | 625 | 188 | 226 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 111 | 108 |
| по лизинговым платежам | 627 | 42 | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | 76 | 1 013 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | - | - |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | - | - |
| прочая задолженность | 632 | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | 6 | 7 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **13 952** | **18 117** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **52 012** | **78 969** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | - | - |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 10 441 | 16 217 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | - | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | - | - |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | - | - |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 006 | 2 | 2 |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | | - |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | 1 | - |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | - | - |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01.2009 года по 31.12.2009 года

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 131 513 | 113 305 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 17 296 | 15 171 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 114 217 | 98 134 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 106 057 | 91 497 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 8 160 | 6 637 |
| Управленческие расходы | 050 | - | - |
| Расходы на реализацию | 060 | 379 | 373 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **7 781** | **6 264** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 5 917 | 7 796 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 47 | 568 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 5 870 | 7 228 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | - | - |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | 33 |
| доходы от операций с активами | 093 | 390 | 6 416 |
| прочие операционные доходы | 099 | 5 480 | 779 |
| Операционные расходы | 100 | 5 820 | 6 478 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | 384 | 6 376 |
| прочие операционные расходы | 109 | 5 436 | 102 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **50** | **750** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 1 198 | 1 784 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 4 | 2 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 1 194 | 1 782 |
| Внереализационные расходы | 150 | 3 468 | 1 651 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-2 274** | **131** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **5 557** | **7 145** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 430 | 174 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | - | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (± 200+210-220)** | **240** | **5 987** | **6 692** |
| Налог на прибыль | 250 | 191 | 174 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 215 | 314 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 1 | 11 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **5 150** | **6 646** |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | 5 150 | 5 874 |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | 0 | 0 |
| Количество прибыльных организаций / сумма прибыли | 330 | 1 / 5 150 | 1 / 6 646 |
| Количество убыточных организаций / сумма убытка | 340 | 0 / 0 | 0 / 0 |

### РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | 46 | 2 | 15 | 33 |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | - | 77 | - | - |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | - | - | - | - |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 937 | 3 029 | 1 642 | 1 463 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | 138 | - | 6 | 2 |
| Прочие доходы и расходы | 400 | 73 | 360 | 119 | 153 |
| **ИТОГО** | **500** | **1 194** | **3 468** | **1 782** | **1 651** |

---

**Усходні гараскоп на наступны тыдзень**

# Блізнятам трэба правільна разлічыць сілы, а Скарпіёнам нельга паддавацца на правакацыі

**АВЕН.** Дзяліцеся вопытам і ведамі, вяртайце даўгі і завяршайце вырашэнне асабістых праблем. Ва ўсіх справах праяўляйце абачлівасць і высакароднасць, засяродзьцеся на галоўным і не марнуйце сілы на рашэнне другарадных задач. Пажадана, каб рост вашай актыўнасці і прадпрымальнасці не ператвараўся ў абагараванне вуліцы. Вы зможаце ў поўнай меры задзейнічаць усе сувязі, але неабходна настойлівасць для пераадолення цяжкасцяў.

**ЦЯЛЕЦ.** Удалым тыдзень будзе для тых прадстаўнікоў знака, хто прывык праяўляць актыўнасць і любіць ваяваць з цяжкасцямі. А іх будзе звышдастаткова, і першая, яна ж галоўная — лянота. Калі вам атрымаецца перамагчы яе і справіцца з дрэнным настроем, разуменне таго, што вашу працу за вас усё адно ніхто не зробіць, будзе не больш чым адзін са стымулаў да працы. Будзьце ўпэўненыя: вашу працавітасць начальства ацэніць у поўнай меры. Калі вы не захочаце праявіць творчасць і ініцыятыву самастойна, вас усё адно прымусяць працаваць, але ўмовы будуць нявыгадна адрозніваца.

**БЛІЗНЯТЫ.** Дзелавая паездка на гэтым тыдні можа адкрыць перад вамі новыя далягляды. Ёсць шанц, што поспех усміхнецца вам, таксама магчымы і заканамерны ўзлёт у кар'еры. Рызыкоўныя прадпрыемствы завершацца паспяхова толькі ў тым выпадку, калі правільна разлічыце свае сілы і не будзеце занадта моцна спадзявацца на дапамогу. Рабіце сваю справу — і дайце іншым займацца сваімі пытаннямі. Цяпер неабходна працаваць на найбліжэйшую будучыню. У пятніцу або суботу верагодна перспектыўнае знаёмства.

**РАК.** Панядзелак — выдатны дзень для адпачынку. Пачатак тыдня досыць аптымістычны. Хоць некаторыя з вашых планаў могуць разваліцца — гэта не падстава для засмучэнняў: яны толькі саступяць месца новым, больш рэалістычным мэтам. У аўторак будуць паспяховыя дзелавыя перамовы, падпісанне дамоў, асабліва ў першай палове дня. Не выпускайце шанцу завязаць новыя карысныя знаёмствы. Больш часу надавайце блізкім людзям: вы можаце натхніць іх на творчы парыў. У чацвер лепш не прымаць сур'ёзных рашэнняў. У гэты дзень паспрабуйце стрымліваць эмоцыі і захоўваць душэўную раўнавагу.

**ЛЕЎ.** Надыходзіць спрыяльны тыдзень для ўзнаўлення фізічнай і творчай формы. У панядзелак не варта палохацца нечаканасцяў — нават калі адбудзецца нешта незапланаванае, усё завершыцца добра. У сераду можаце пацешыць усіх, у тым ліку і сябе, высокімі прафесійнымі дасягненнямі і нават прасунуцца па кар'ернай лесвіцы. У чацвер хтосьці вам, хутчэй за ўсё, моцна нашкодзіць, парушыўшы ўсе вашы планы. Паспрабуйце не помсціць: бо ўжо ў пятніцу або ў суботу можаце дабіцца добразычлівасці начальства і пашырыць сферу сваёй дзейнасці.

**ДЗЕВА.** Вам па сілах вырашыць не толькі свае задачы, але і некаторыя праблемы навакольных. Займіцеся ўласнай знешнасцю і будзьце больш актыўнымі. У панядзелак настойлівасць у дасягненні мэты прывядзе да добрых вынікаў. У сераду трымайце пад кантролем свае пачуцці, не давайце выхаду агрэсіі, інакш можаце здзейсніць непапраўную памылку. У гэты дзень імкніцеся не выпускаць з выгляду нават малаважных дробязяў.

**ШАЛІ.** Тыдзень будзе напоўнены разнастайнымі падзеямі. Ён ідэальна падыходзіць як для адпачынку, так і для працы. Аднак чым бы вы ні займаліся, не забывайце пра сяброў — ім патрэбна не толькі ўвага, але і пэўная дапамога. Не варта рабіць штосьці праз сілу — усё адно не атрымаецца. Лепш і не брацца, калі займацца чымсьці зусім не хочацца. Найболей спрыяльнымі для вас на гэтым тыдні будуць аўторак і субота, няўдалым днём можа стаць пятніца.

**СКАРПІЁН.** Пажадана абмежаваць залішнюю актыўнасць. Мітусня можа саслужыць дрэнную службу і адмоўна адбіцца на вашым аўтарытэце. Калі не ўпэўненыя ў сваіх дзеяннях, лепш не спяшайцеся: гэтая прадбачлівасць дазволіць пазбегнуць шматлікіх праблем у наступным. Не эканомце час на сне, каб безуважлівасць не згуляла з вамі злы жарт. Будуючы планы, пакіньце ў рэзерве яшчэ некалькі варыянтаў, каб раптоўныя змены не змаглі выбіць вас з каляіны. У панядзелак не паддавайцеся на правакацыі — і тады не давядзецца шкадаваць аб зробленым, назіраючы вынікі сваіх не ў меру імпульсіўных учынкаў.

**СТРАЛЕЦ.** Паспрабуйце нікуды не спазняцца, выконваць свае абяцанні і не гаварыць лішняга. Будзьце больш асцярожнымі: не паддавайцеся спакусе крытыкаваць калегаў, бо яны цяпер павінны адчуваць вашу падтрымку. Вучыцеся не толькі слухаць, але і чуць — гэтая якасць вельмі спатрэбіцца. Таварыскасць дазволіць пашырыць дзелавыя сувязі і наладзіць новыя важныя кантакты. Акрамя гэтай каштоўнай якасці давядзецца таксама праявіць мудрасць, гнуткасць і дальнабачнасць.

**КАЗЯРОГ.** Добры час для паўнавартаснага адпачынку. Вандраванні будуць поўныя разнастайных уражанняў, вы пазнаеце шмат новага і цікавага. Тыя ж прадстаўнікі знака, чые адпачынкі пакуль не пачаліся, змогуць з поспехам вырашыць іншыя задачы. У сераду магчымая вельмі далікатная сітуацыя на працы, якая паставіць вас у цяжкае становішча. Пажадана не спрачацца і не канфліктаваць з начальствам. Пятніца, наадварот, стане адным з самых удалых дзён тыдня, фартуна асабліва будзе добразычлівая да прасоўвання па кар'ернай лесвіцы або да праявы творчай ініцыятывы.

**ВАДАЛЕЙ.** Смела можаце пашыраць сферу свайго ўплыву ў любой цікавай вам галіне. Але пазбягайце рабіць тое, чаго вам рабіць катэгарычна не хочацца. У чацвер і пятніцу не варта залішне турбавацца з-за падзей, якія адбываюцца, бо зоркі абяцаюць: усё складзецца найлепшым чынам.

**РЫБЫ.** Пастурова вырашыце практычна ўсе назапашаныя справы. Усе неспадзеўкі, прыемныя і не вельмі, будуць у асноўным звязаныя з працай. Вам неабходна супакоіцца і засяродзіцца на найважнейшым, пры гэтым не выпускайце дробязяў. Паспрабуйце не дапускаць у працы прамашак, бо іх будзе складана выправіць. Добры момант для змены іміджу. Паспрабуйце ахаваць дзяцей ад імпульсіўных і неабдуманых учынкаў. Вас могуць наведаць арыгінальныя ідэі, якія пажадана дзе-небудзь запісаць.

---

Организация:

## ОАО «ЛИДАПИЩЕКОНЦЕНТРАТЫ»

Учетный номер плательщика: **500021268**
Вид деятельности: **производство пищевых концентратов**
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **КОНЦЕРН «БЕЛГОСПИЩЕПРОМ»**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **231300, г. Лида, ул. Тавлая, 11.**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2010

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость (01) | 101 | **21633** | **23337** |
| амортизация (02) | 102 | **11930** | **12957** |
| остаточная стоимость | 110 | **9703** | **10380** |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость (04) | 111 | **16** | **4** |
| амортизация (05) | 112 | **13** | **4** |
| остаточная стоимость | 120 | **3** | **-** |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость (03) | 121 | - | - |
| амортизация (02) | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | 130 | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы (07, 08) | 140 | **1859** | **2999** |
| в том числе: незавершенное строительство (08) | 141 | **1357** | **2193** |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **11565** | **13379** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | **6780** | **9998** |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы (10, 15, 16) | 211 | **2982** | **3554** |
| животные на выращивании и откорме (11) | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты (20, 21, 23, 29) | 213 | - | - |
| расходы на реализацию (44) | 214 | **147** | **240** |
| готовая продукция и товары для реализации (40, 41, 43, 44) | 215 | **1440** | **2852** |
| товары отгруженные (45) | 216 | **2036** | **3341** |
| выполненные этапы по незавершенным работам (46) | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов (97) | 218 | **175** | **11** |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам (18, 76) | 220 | **326** | **408** |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | **2** | - |
| в том числе: покупателей и заказчиков (62) | 231 | **2** | - |
| прочая дебиторская задолженность (60, 76) | 232 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | **1185** | **632** |
| в том числе: покупателей и заказчиков (62) | 241 | **914** | **251** |
| поставщиков и подрядчиков (60) | 242 | **165** | **99** |
| по налогам и сборам (68, 69) | 243 | **8** | **209** |
| по расчетам с персоналом (70, 71, 73) | 244 | **29** | **36** |
| разных дебиторов (76) | 245 | **15** | **13** |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | **54** | **24** |
| Расчеты с учредителями (75) | 250 | - | - |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд (75) | 251 | - | - |
| прочие (75) | 252 | - | - |
| Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57) | 260 | **420** | **254** |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах (55) | 261 | - | - |
| Финансовые вложения (58) | 270 | **2** | - |
| Прочие оборотные активы (79, 94) | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **8715** | **11292** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **20280** | **24671** |

| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд (80) | 410 | **72** | **71** |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81) | 411 | - | - |
| Резервный фонд (82) | 420 | **4** | **4** |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | **4** | **4** |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд (83) | 430 | **11374** | **12845** |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99) | 440 | **x** | **x** |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) (84) | 450 | **11** | **292** |
| Целевое финансирование (86) | 460 | **4** | - |
| Доходы будущих периодов (98) | 470 | **20** | **3** |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **11485** | **13215** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы (67) | 510 | **1150** | **1538** |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | **47** | **15** |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **1197** | **1553** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы (66) | 610 | **4649** | **6437** |
| Кредиторская задолженность | 620 | **2896** | **3368** |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками (60) | 621 | **2095** | **2903** |
| перед покупателями и заказчиками (62) | 622 | **16** | **32** |
| по расчетам с персоналом по оплате труда (70) | 623 | **240** | **278** |
| по прочим расчетом с персоналом (71, 73) | 624 | **4** | **5** |
| по налогам и сборам (68) | 625 | **466** | **52** |
| по социальному страхованию и обеспечению (69) | 626 | **70** | **85** |
| по лизинговым платежам (76) | 627 | - | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | **5** | **13** |
| Задолженность перед участниками (учредителями) (75) | 630 | **53** | **98** |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | **13** | **23** |
| прочая задолженность | 632 | **40** | **75** |
| Резервы предстоящих расходов (96) | 640 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства (79) | 650 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **7598** | **9903** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **20280** | **24671** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | - | - |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | **2896** | **3368** |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | - | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | **29** | **21** |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | **115** | **57** |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | - | - |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | - | - |
| Бланки строгой отчетности | 006 | - | - |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | - | - |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | **1145** | **377** |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | - | - |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | - | - |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | **-2** | **1** |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | **60** | **59** |
| Товары, отгруженные в отпускных ценах | 015 | **3984** | **4745** |
| Имущество, находящееся в совместном владении | 016 | - | - |
| Именные приватизационные чеки «Имущество» | 017 | - | - |
| Материалы, оборудование, принятые (переданные) в рамках гарантийных обязательств | 018 | - | - |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01.2009 г. по 31.12 2009 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | **28892** | **24903** |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | **5693** | **5384** |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | **23199** | **19519** |
| **СПРАВОЧНО** из строки 010: сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | **19401** | **17053** |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | **3798** | **2466** |
| Управленческие расходы | 050 | - | - |
| Расходы на реализацию | 060 | **1669** | **1350** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060) | 070 | **2129** | **1116** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | **1349** | **1199** |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | **121** | **75** |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | **1228** | **1124** |
| в том числе: проценты к получению | 091 | - | - |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | - | - |
| доходы от операций с активами | 093 | **1228** | **1124** |
| прочие операционные доходы | 099 | - | - |
| Операционные расходы | 100 | **750** | **1170** |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | **750** | **1170** |
| прочие операционные расходы | 109 | - | - |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | 120 | **478** | **-46** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | **132** | **139** |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | **7** | **9** |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | **125** | **130** |
| Внереализационные расходы | 150 | **526** | **429** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | **-401** | **-299** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160) | 200 | **2206** | **771** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | **428** | **667** |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | - | - |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220) | 240 | **2634** | **1438** |
| Налог на прибыль | 250 | **613** | **320** |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | **171** | **150** |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | **6** | **34** |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270) | 300 | **1416** | **267** |
| **СПРАВОЧНО** (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | - |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | **1397** | **267** |
| Количество прибыльных организаций по конечному финансовому результату | 330 | **1** | **1** |
| Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату | 330А | **1416** | **267** |
| Количество убыточных организаций по конечному финансовому результату | 340 | - | - |
| Сумма полученного убытка по конечному финансовому результату | 340А | - | - |

### РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | **29** | **6** | **8** | **14** |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | | **3** | | **7** |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | | **24** | **25** | |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | **8** | **5** | **1** | **4** |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | **32** | **11** | **29** | **12** |
| Прочие доходы и расходы | 400 | **56** | **477** | **67** | **392** |
| **ИТОГО** | 500 | **125** | **526** | **130** | **429** |

**Генеральный директор** — **Пекарский Николай Николаевич**

**Главный бухгалтер** — **Бурак Надежда Ивановна**

Інстытут «Магілёўграмадзянпраект»

# ЁСЦЬ УДАСКАНАЛЕННЕ, ЁСЦЬ І ПЕРСПЕКТЫВА



**АПОШНІМ часам Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва разам з Саюзам будаўнікоў праводзяць штогадовы конкурс на лепшыя дасягненні ў будаўнічай галіне. Рэгулярна ўдзельнічае ў гэтым конкурсе, прычым заўсёды выходзіць пераможцам у адной з намінацый, інстытут «Магілёўграмадзянпраект». У першы раз ён выйграў у намінацыі «Кіраўнік года» — адпаведна, пераможны прыз дастаўся дырэктару інстытута Міхаілу Краснову; у другі і трэці раз адзначаны яго праекты адміністрацыйнага цэнтра «Гарадзец» Шклоўскага раёна і Магілёўскага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па конным спорце і сучасным пяцібор'і. А сёлета інстытут удзельнічае ў конкурсе ў намінацыі «Арганізацыя года». Можна меркаваць, што ў калектыву ёсць добры шанц адзначыцца ў чарговы раз.**

Дарогу да інстытута, як нас інфармавалі перад паездкай, знайсці даволі проста: ад аўтавакзала па праспекце Міру і на вуліцу Ленінскую, дзе вас сустрэне цікавая скульптурная кампазіцыя «Астролаг» (у рускім варыянце — «Звездочёт»), а праз якіх сто крокаў — і інстытут. Дарэчы, калі ўжо мы закранулі гэтага «Астролага», тут жа зазначым: гэта кампазіцыя, выкананая гадоў каля пяці таму, створана менавіта з удзелам аўтарскага калектыву інстытута (можна нават меркаваць, што тут такім чынам абазначылі да сябе тую ж дарогу) і, кажуць, напачатку выклікала пэўныя спрэчкі: маўляў, а ці так ужо патрэбен гораду гэты астролаг? А між тым, гэта кампазіцыя яўна куды больш цікавая, чым, напрыклад, скульптурны юнак каля мінскага прывакзальнага сквера, няхай і «выстаўлены» ён з яўна жартаўлівай мэтай. Дарэчы, магілёўскі «Астролаг» удастоены спецыяльнага дыплома Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.

...Аднак вось і інстытут. Насуперак чаканням, ён мае даволі сціплы знешні выгляд — відавочна быў запраектаваны ў эканомныя на ўсякія архітэктурныя асаблівасці гады. Затое ў гэтым сціплым будынку яго наведвальнікі, калі яны дэталёва пазнаёмяцца з працай калектыву, абавязкова ўбачаць даволі багаты ўнутраны змест. Багаты як у плане аснашчэння, тэхнічных магчымасцяў калектыву, так і ў плане яго творчых магчымасцяў, творчага патэнцыялу, што вельмі лёгка можна пацвердзіць на прыкладзе створаных тут праектаў, і ў прыватнасці — створаных у апошнія гады.

Мы папрасілі начальніка тэхнічнага аддзела інстытута, старшыню назіральнага савета (а інстытут з'яўляецца акцыянерным таварыствам) Валерыя Елісеева пазнаёміць нас з асобнымі з гэтых праектаў, ці дакладней з тымі з іх, якія ўжо жывуць самастойным жыццём, гэта значыць перабраліся з праектных кабінетаў на гарадскія вуліцы і праспекты.

Не так далёка ад цэнтра горада на плошчы каля гектара вольна раскінуўся прыгожы спартыўны комплекс «Алімпіец». Безумоўна, гэты аб'ект, запраектаваны ў інстытуце ў свой час, — адзін з найбольш цікавых. (За яго стварэнне калектыў інстытута таксама адзначаны спецыяльным дыпломам.) Комплекс поўнасцю знаходзіцца пад дахам, у ім могуць займацца многімі відамі спорту адначасова каля тысячы чалавек; улічана таксама магчымасць яго наведвання інвалідамі. Пры праектаванні «Алімпійца» аўтарскі калектыў інстытута прапанаваў у сваёй працы шэраг новых, арыгінальных тэхнічных рашэнняў, асобныя з якіх ацэньваюцца на ўзроўні вынаходства. Адным з унікальных элементаў гэтага комплексу з'яўляецца стальны купал дыяметрам 54 метры, які накрывае яго цэнтральную частку. Пры гэтым у інстытуце спачатку ніяк не маглі знайсці выканаўцу адпаведнай працы (у якасці субпадрадчыка) — ніхто ў краіне, а таксама ў Расіі за яе не браўся, складанасць гэтай працы заключалася не толькі ў канструяванні і вырабе самога купала, але і ў тым, каб спалучыць метал купала з жалезабетонным контурам, прымусіць іх рабочыя зоны ўзгоднена, разам працаваць. Знайшлі выканаўцу сярод сваіх партнёраў — інстытут «УкрНДІпраектстальканструкцыя»...

Унікальны аб'ект паказалі нам і на скрыжаванні праспекта Пушкіна і вуліцы Габраўскай, які пакуль што стаіць у будаўнічых рыштаваннях. Гэта — Спаса-Праабражэнскі сабор. Паводле слоў Валерыя Елісеева, грунты ў гэтым месцы — ненадзейныя (нізіна, з заляганнем маламоцных грунтоў), і сюды, на пляцоўку, на ўсю тэрыторыю, якую павінна была заняць гэта культавая ўстанова, «усім горадам» вазілі пясок, амаль год трамбавалі яго. Узвядзенне храма яшчэ працягваецца, хоць і знаходзіцца ў стадыі завяршэння, аднак ён ужо цяпер упрыгожвае горад сваім велічным выглядам.

Валерый Елісееў паказаў нам і іншыя аб'екты, якія створаны і ўвасабляюцца або ўжо ўвасобленыя ў жыццё. Гэта гандлёвы цэнтр «Прэстан», гасцініца «Турыст» і іншыя аб'екты, гэта таксама, вядома ж, жылыя мікрараёны Магілёва, кожны з якіх (з запраектаваных і ўзведзеных за апошнія 10—20 гадоў) нясе ў сабе добра адметнае архітэктурнае аблічча, уласцівае толькі яму, кожны з якіх ужо ніяк не зблытаеш з іншым. Няхай яны і створаныя ў адным і тым жа



праектным інстытуце, няхай і размешчаны ў адным горадзе. Словам, гэта ўжо далёка не тое, да чаго, па выказванні Валерыя Елісеева, мы прывыклі раней: хочаш у Магілёве паглядзі мікраараён, хочаш у Брэсце... Прычым, як падкрэсліваюць у інстытуце, адпаведныя, добрыя магчымасці для творчасці і фантазіі дае сам Магілёў — з яго «трыма ўзроўнямі»: пагоркамі і тэрасамі, створанымі тут прыродай, цудоўнай зялёнай поймай Дняпра і глыбокімі маляўнічымі ярамі...

А яшчэ Валерый Мікалаевіч расказаў пра цікавы аперацыйны модуль пры гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, які запраектаваны і ўзведзены «пад ідэю» магілёўскага ж медыка і ў якім магчыма выконваць аперацыі адначасова ў пяці аперацыйных залах.



*<u>ДЛЯ ДАВЕДКІ.</u> Інстытут «Магілёўграмадзянпраект» займаецца комплексным праектаваннем аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва — жылых дамоў, школ, бальніц, банкаў і г.д. У яго склад уваходзяць як праектныя падраздзяленні — архітэктурна-канструктарскія аддзелы, аддзелы водазабеспячэння і каналізацыі; цеплазабеспячэння і вентыляцыі; газазабеспячэння; сувязі і сігналізацыі; электраабсталявання і электразабеспячэння; аддзел тэхналагічных работ, так і вышукальныя — аддзелы топагеаздымкі і інжынернай геалогіі, а таксама аддзелы аўтаматызаваных сістэм; каштарысу і арганізацыі будаўніцтва; экалогіі; рэдакцыйна-выдавецкі аддзел і іншыя падраздзяленні і службы. Інстытут «Магілёўграмадзянпраект» з'яўляецца найбуйнейшай праектнай арганізацыяй у Магілёве і Магілёўскай вобласці. У склад інстытута ўваходзіць, у якасці яго філіяла, архітэктурна-канструктарская комплексная майстэрня № 4 у Бабруйску. Крыху больш за год таму інстытут «Магілёўграмадзянпраект» адзначыў сваё 70-годдзе.*





Супрацоўнікамі інстытута на чале з яго старэйшым работнікам Раманам Алексіным (з 1955 года працуе ён у інстытуце, імя Алексіна за яго важкі ўнёсак у абуладкаванне Магілёва занесена ў гарадскую Кнігу славы) спраектавалі новую, прыгожую і вельмі важную па значнасці транспартную артэрыю — вуліцу Лазарэнкі, якая вядзе ў мінскім напрамку; яна дапамагла, пасля ўвасаблення праекта ў жыццё, разгрузіць праспект Міру. На рахунку калектыву таксама запамінальны будынак гарадскога дыягнастычнага цэнтра, арыгінальны будынак Белінвестбанка, касцёл Святога Антонія (будуецца), прыгожы вучэбна-лабараторны корпус са спарткомплексам Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (праект), зноў-такі арыгінальны будынак цэнтральнай раённай бальніцы ў Касцюковічах, крыты басейн з аквапаркам у Бабруйску, прыгожы аграгарадок ААТ «Александрыйскае» ў Шклоўскім раёне, этнаграфічны музей пад адкрытым небам «Беларуская вёска» ў Буйнічах, вяслярны канал на Дняпры ў Магілёве (праект) і многія іншыя аб'екты — усе, як правіла, цікавыя і непаўторныя; у інстытуце былі распрацаваны генеральныя планы Дрыбіна, Горак, Бялынічаў, Клімавічаў, Касцюковічаў, Шклова і іншых раённых цэнтраў Магілёўшчыны.

* * *

Хто хоць трохі знаёмы з праектнай працай, той, вядома ж, няблага ведае пра чарцёжную дошку, без якой раней праекціроўшчыкам было ну проста нікуды. Добрую службу саслужыла яна ім, нямала цікавых праектаў нарадзілася на ёй. А, можа, дзе-нідзе нараджаюцца і цяпер...

Але толькі ўжо не ў інстытуце «Магілёўграмадзянпраект». З прыходам сюды да кіраўніцтва новага дырэктара тут, паводле расказаў супрацоўнікаў інстытута, аб'явілі гэтую дошку самым што ні ёсць архаічным элементам, які падлягае спісанню ва ўтыль. Няхай і выпрабавана яна гадамі, але даволі марудна справа на ёй рабілася, ды і людзей шмат на ёй было задзейнічана. Словам — несучаснай яна стала. І спісалі. А месца чарцёжных дошак (ці інакш — кульманаў) занялі камп'ютары. Не так проста даўся калектыву гэты пераход на сучасныя сродкі праектавання, ва ўсякім разе — далёка не для ўсіх. На першым часе нават страцілі ў аб'ёмах вытворчасці. Затое вельмі добра выйгралі ў наступным. Некалі, ці, дакладней, на пачатку гэтага дзесяцігоддзя, у інстытуце было каля 20—25 камп'ютараў — цяпер іх каля 300, ды яшчэ 8 сервераў, да якіх яны падключаны; увесь праграмна-вылічальны комплекс аб'яднаны ў адзіную вылічальную сетку. Адпаведна, непараўнальна з ранейшым павысіліся хуткасць і якасць праектавання. Пра многае сведчаць, напрыклад, такія лічбы: калі раней у інстытуце выконвалі праектных работ на мільярд 200 мільёнаў рублёў, то ў мінулым годзе выканалі іх на 20 мільярдаў; прадукцыйнасць працы вырасла ў некалькі разоў.

Сучасныя сродкі па праектаванні, а таксама па выкананні іншых работ прыйшлі практычна на ўсе працоўныя месцы, доля аўтаматызацыі ўсіх гэтых работ, як сведчаць у інстытуце, дасягнула 90 працэнтаў. Падчас яго наведвання нас пазнаёмілі з працай асобных падраздзяленняў. У інстытуце разам з праектаваннем ажыццяўляюць таксама вышукальную дзейнасць, якая, зразумела, папярэднічае таму ж праектаванню, пры гэтым тут дзейнічае акрэдытаваная лабараторыя па даследаванні грунтоў. Як расказала начальнік аддзела інжынернай геалогіі Людміла Белькаўцова, аддзел мае абсталяванне і праводзіць статычнае і дынамічнае зандзіраванне грунтоў, а таксама іх так званыя штампавыя даследаванні (пры гэтым на пэўнай плошчы будучага падмурка ствараецца ціск, роўны таму, які грунт атрымаў бы пад тым ці іншым збудаваннем). Вынікі ўсіх гэтых даследаванняў улічваюцца канструктарамі пры разліках фундаментаў і ўвогуле — канструкцый збудаванняў.

Зразумела, каб мець узоры тых жа грунтоў, іх трэба спачатку ўзяць (дарэчы, бяруцца яны на глыбіні да 25—30 метраў). Для гэтай мэты інстытут мае свае буравыя ўстаноўкі, прычым нядаўна набыў новую, сёлета тут пачалі асвойваць перасоўную лабараторыю для статычнага зандзіравання грунтоў. Даследчыкі, якія працуюць у палявых умовах, маюць магчымасць перадаць адпаведную інфармацыю ў камп'ютарную сетку інстытута, што значна павышае аператыўнасць усёй працы.

— Мы займаемся камплектаваннем, множаннем, брашураваннем і выдачай усёй напрацаванай у інстытуце дакументацыі, якая паступае да нас як у электронным, так і ў папяровым выглядзе, непасрэдна заказчыку, — расказвала ўжо начальнік рэдакцыйна-выдавецкага аддзела Святлана Краснажон. — У нас для гэтых мэтаў ёсць сучасныя інжынерныя сістэмы, каляровы плотар, а таксама капіравальна-размнажальная тэхніка. Нашы машыны могуць працаваць як у аўтаномным рэжыме, так і ў лакальнай інстытуцкай сетцы. Гэта значыць, што на іх можна выпусціць любую дакументацыю з любога працоўнага месца інстытута, што, вядома, вельмі зручна для яе распрацоўшчыкаў.

Можа, на фоне абазначаных намі аддзелаў крыху і не сучасна глядзіцца група навукова-тэхнічнай інфармацыі са сваімі вялізнымі шафамі, пад завязку забітымі папяровымі папкамі. Аднак, як расказвала начальнік групы Ніна Белая, гэта — пэўная асаблівасць іх працы, неабходнасць захоўваць інфармацыю як у электронным, так і ў папяровым выглядзе. А ўвогуле, па выказванні Ніны Белай, дзейнасць іх групы — гэта сук, на якім сядзіць увесь інстытут. І гэта сапраўды так, бо любы праект пачынаецца менавіта са збору пэўнай інфармацыі, знаёмства з адпаведнымі нарматыўна-прававымі актамі, якія прымяняюцца на будоўлі цяпер, знаёмства з тым, што прапануюць вытворцы будаўнічых матэрыялаў, з пажарнымі, санітарнымі, экалагічнымі нормамі і г.д. Усё гэта і «занатавана» на вытворчых плошчах групы, і не толькі ў камп'ютарнай памяці, але, літаральна, раскладзена ў папяровым варыянце на шматлікіх паліцах у тых жа вялізных шафах. Тут захоўваюцца нават ужо адмененыя нарматыўныя дакументы — а раптам патрабуецца даведка па раней узведзеных аб'ектах, пры праектаванні якіх гэтыя нормы прымяняліся... Паводле слоў Валерыя Елісеева, група нарматыўна-тэхнічнай інфармацыі інстытута — адна з найлепшых у краіне; тут можна знайсці адказ на любое пытанне, якое датычыцца праектавання і ў цэлым будаўніцтва і будаўнічай галіны...

Такім чынам, як падкрэслівалі ў інстытуце, той тэхнічны, а таксама кадравы патэнцыял, які цяпер тут ёсць, дазваляе калектыву ствараць якасныя, арыгінальныя праекты, па якіх можна ўзводзіць «прыстойныя» збудаванні. Інстытут адным з першых у краіне ўкараніў у сябе сістэму менеджменту якасці згодна са стандартамі ISO 9001; тут наладжана пастаянная тэхнічная вучоба, падчас



якой яго супрацоўнікі знаёмяцца з новымі тэхналогіямі ў праектаванні і будаўніцтве ў цэлым, з новымі матэрыяламі; не застаюцца без увагі розныя тэматычныя семінары, выставы і г.д. Усё гэта ў комплексе і дазваляе выконваць тыя ж праекты на высокім узроўні, з улікам усіх сучасных патрабаванняў у галіне будаўніцтва.

— Адным з крытэрыяў якасці праекта з'яўляецца паспяховае праходжанне ім дзяржаўнай экспертызы, — падкрэслівае галоўны інжынер інстытута, кандыдат тэхнічных навук Сяргей Ірванцоў. — Нашы праекты праходзяць гэту экспертызу, як правіла, без асаблівых заўваг. Адзначу таксама: апошнім часам, у адпаведнасці з рашэннем урада і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, мы пачалі пераходзіць на еўрапейскія нормы праектавання і будаўніцтва. Гэтыя нормы ўведзены ў ЕС зусім нядаўна, з 1 студзеня. Пераход на іх дазволіць гарманізаваць прынцыпы айчыннага праектавання з еўрапейскімі, добра паўплывае на інвестыцыйныя працэсы. У прыватнасці, замежнаму інвестару лягчэй будзе рэалізаваць свае адпаведныя праекты ў нас, з іншага боку — больш аптымальныя ўмовы будуць створаны і для экспарту нашых будаўнічых паслуг.

Варта тут жа, да слоў галоўнага інжынера, дадаць: інстытут ужо мае адпаведны экспартны вопыт. У прыватнасці, ён удзельнічаў у праектаванні мікрараёна Куркіна ў Маскве, выконваў асобныя праекты для расійскіх гарадоў Бранска і Рослаўля. Інстытут і цяпер, хоць ужо і не экспартуе свае паслугі (як зазначаюць тут, хапае працы ў вобласці і непасрэдна ў самім Магілёве, у якім цяпер «вельмі шмат чаго цікавага робіцца»), мае сваё прадстаўніцтва ў Смаленску, а таксама адпаведныя расійскія ліцэнзіі. Ці дакладней, як зазначаў начальнік тэхнічнага аддзела, з гэтага года ў Расіі, замест ліцэнзавання, уведзены інстытут так званых самарэгулюемых арганізацый. «Будзем уступаць, — падкрэсліваў ён. — Мець запасны аэрадром ніколі не пашкодзіць».

Нельга не сказаць у гэтым матэрыяле колькі слоў і пра сувязі інстытута з будаўнічым комплексам краіны, з вытворцамі будаўнічых матэрыялаў. А ў прыватнасці, у ім вельмі чуйна ўлоўліваюць усе тэндэнцыі ў сучасным айчынным будаўніцтве, усе тэхналагічныя змены і новаўвядзенні ў працы домабудаўнічых камбінатаў, трэстаў і г.д., а пры ўсім гэтым арыентуюцца на выкарыстанне будаўнікамі выключна айчынных будаўнічых матэрыялаў і абсталявання, што, адпаведна, і адлюстроўваюць у сваіх праектах. Напрыклад, цяпер у домабудаванні яўна намячаецца ўхіл на ўзвядзенне дамоў з маналітнага жалезабетону — у інстытуце гатовыя прапанаваць адпаведныя праекты: тут прадбачылі гэты кірунак і загадзя падрыхтаваліся да яго, набылі пэўны вопыт. Не вычарпала сваіх магчымасцяў і панэльнае домабудаванне, іншая рэч — як лепш разнастаіць яго архітэктуру. Новыя магчымасці для гэтага дае Магілёўскі домабудаўнічы камбінат: ён асвоіў выпуск 14 тыпаў так званых шыротных блок-секцый, распрацаваных інстытутам БелНДІПТБ сумесна з магілёўскім інстытутам, выкарыстанне якіх значна пашырае магчымасці праекціроўшчыкаў. Адпаведна, у інстытуце з задавальненнем сустрэлі гэту новую тэхналогію і, адпаведна ж, гатовыя даць будаўнікам больш цікавыя і больш разнастайныя праекты. Дарэчы будзе яшчэ раз нагадаць тут пра тое, што жылыя мікрараёны Магілёва, асабліва ўзведзеныя апошнім часам, нават пры вельмі вузкіх магчымасцях панэльнага домабудавання, вызначаюцца сваёй непаўторнасцю і пазнавальнасцю. Гэта дасягнута за кошт пэўнай афарбоўкі дамоў, розных канструкцыйных асаблівасцяў іх лоджый і г. д., а яшчэ — за кошт максімальнага выкарыстання архітэктарамі складанага прыроднага ландшафту, якім «адзначаны» Магілёў.

* * *

Няйначай, магіляўчан чакаюць яшчэ больш цікавыя праекты, распрацаваныя ў іх вядучым праектным інстытуце. Яшчэ раз звернемся да ўзятага ў інстытуце курсу на выкарыстанне самых сучасных сродкаў праектавання. Да нядаўняга часу ў ім выкарыстоўвалася камп'ютарная так званая праграма «Аўтакад», цяпер тут асвойваюць нашмат больш прагрэсіўную праграму «Рэвіт», якая дазваляе «бачыць» праектуемы аб'ект у трохмерным мадэляванні. Паводле слоў галоўнага інжынера, пробныя аб'екты з дапамогай гэтай праграмы ўжо выкананы.

## «МЫ ЎСЕ — ПАТРЫЁТЫ СВАЙГО ГОРАДА»

Так сказаў падчас гутаркі дырэктар інстытута «Магілёўграмадзянпраект» Міхаіл Красноў. А пры гэтым удакладніў (у прыватнасці, наконт сябе): «Хто хоць дзень папрацаваў мэрам, той патрыёт горада ўжо на ўсё жыццё».

Як зразумела ўжо, Міхаіл Красноў быў у свой час мэрам горада. З ім наша гутарка.

***— Міхаіл Аляксеевіч, ваш праектны інстытут — вядучы ў Магілёве, ад яго калектыву залежала і залежыць, ці мае (будзе мець) горад свой непаўторны твар? Удалося?***

— А вы прайдзіце па вуліцах і праспектах сённяшняга Магілёва і самі ацаніце. Думаю, што нам удалося дабіцца шмат чаго ў стварэнні своеасаблівага архітэктурнага аблічча горада, стварэнні яго цэласнага архітэктурнага ансамбля, хоць, дарэчы, гэтага і нялёгка было дасягнуць, напрыклад, на аб'ектах бюджэтнага будаўніцтва.

Тут жа ўдакладню: мы размешчаны не проста ў Магілёве, а на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, адпаведна — і заказы выконваем па ўсёй вобласці, і для нас не ўсё роўна, якое аблічча маюць і будуць мець і нашы райцэнтры.

***— Якія крытэрыі маюць на ўвазе вашы праекціроўшчыкі, «малюючы» той ці іншы аб'ект?***

— Гэты аб'ект павінен быць эканамічна выгадным, адпавядаць усім эстэтычным патрабаванням, ну, і калі гэта жылы дом, быць для яго жыхароў максімальна ідэальным па сваіх выгодах (хоць мы ў гэтым выпадку і пастаўлены ў рамкі агульных спажывецкіх якасцяў). Ну, а калі гэта датычыцца аб'ектаў грамадскага прызначэння, напрыклад, спартыўных аб'ектаў, вядома, там у яго стваральнікаў можа і павінна быць дастаткова фантазіі для самавыяўлення, для надання аб'екту арыгінальных асаблівасцяў, бо не кожны дзень і не кожны год узводзім



мы палацы спорту, медыцынскія ўстановы, кінатэатры...

Пры гэтым, маючы на ўвазе тое, што ў кожнага архітэктара, праекціроўшчыка ёсць свой почырк і свой стыль, гэта зусім не азначае таго, што менавіта ён выключна ўсё і вырашае. Усе архітэктурна-праектныя прапановы абавязкова абмяркоўваюцца ў калектывах падраздзяленняў, а на тэхнічных саветах інстытута па іх прымаецца канчатковае рашэнне.

***— Якія прыярытэтныя кірункі вызначаны цяпер у вашай працы, ці, дакладней — якім аб'ектам цяпер надаецца большая ўвага?***

— Гэты кірунак вызначыла дзяржава — жыллёвае будаўніцтва, а для нас, адпаведна, — яго праектаванне.

Да гэтага праектаванне жылля ў нашых аб'ёмах займала прыкладна 25 працэнтаў, сёлета павінны выйсці недзе на 35 працэнтаў, астатняе — аб'екты сацкультбыту. За мінулы год інстытут выканаў праектных работ у цэлым на 20 мільярдаў рублёў, сёлета працэнтаў на 15 павінны прырасці. Партфель заказаў на гэты год сфарміраваны ў поўным аб'ёме.

Адзначу, што тыя аб'ёмы, якія будаўнічы комплекс мае цяпер, гадоў 6-7 таму ён не выцягнуў бы. Адпаведныя зрухі адбыліся дзякуючы клопату дзяржавы, дзякуючы таму, што для будаўнікоў выдзелілі інавацыйныя сродкі — для набыцця новай тэхнікі, механізмаў і г.д.

***— Апошнім часам у аблічча нашых буйных гарадоў актыўна ўварваліся паркінгі. Напрыклад, у Мінску. Шчыра сказаць, не надта ўпрыгожваюць яны сваімі пустымі праёмамі горад, увогуле — упісваюцца ў яго архітэктурны ансамбль. Як вы да гэтага ставіцеся?***

— Неадназначна. Паркінгі, безумоўна, патрэбныя. Але, напрыклад, у іншых краінах іх неяк «хаваюць» за фасадамі іншых будынкаў, паркінгі не адкрываюцца назойліва на праезныя часткі. А ўвогуле, у цэнтральнай частцы гарадоў не павінна быць месца для гэтых монстраў. Што датычыцца Магілёва — спрабавалі і ў ім прабіць месца для паркінга ў цэнтральнай частцы горада. Гэта задумка не прайшла, сказалі яе ініцыятарам так: калі ласка, узводзьце там, дзе яры (а яроў у нас нямала), але толькі не ў цэнтры.

***— Міхаіл Аляксеевіч, вы неяк сказалі: «Без удасканалення не можа быць перспектывы». Гэта датычыцца таго ж тэхнічнага ўдасканалення працы калектыву, якое зроблена за апошнія гады?***

— Ну, вядома ж, не толькі. Праца ў праектным інстытуце — творчая, і вельмі многае залежыць ад кадраў, ад іх уласнага імкнення пастаянна ўдасканальвацца, пастаянна працаваць над сабой. Увогуле, каб стаць сапраўдным архітэктарам, канструктарам, для гэтага патрэбна каля 10 гадоў. У нас гэтай мэце няблага служыць інстытут настаўніцтва; у прыватнасці маладыя спецыялісты на працягу паўгода знаходзяцца пад апекай больш спрактыкаваных работнікаў. У цэлым, лічу, у інстытуце склаўся здольны, творчы калектыў, якому па сіле любыя праекты.

***— І на заканчэнне яшчэ колькі слоў пра Магілёў.***

— Я люблю гэты прыгожы горад, сам нямала папрацаваў над тым, каб ён стаў такім, які ён ёсць цяпер. І менавіта так можа сказаць любы з супрацоўнікаў інстытута (а наш інстытут, па сутнасці, з'яўляецца асноўнай праектнай арганізацыяй у горадзе, менавіта з яго сценаў выйшла пераважная частка праектаў). Магілёў некалькі гадоў запар займае лідзіруючыя пазіцыі сярод абласных цэнтраў па добраўпарадкаванні, у ім намнога больш прыстасаванымі сталі праезды, тратуары. А якую гаму фарбаў нясуць на сабе нашы шматпавярховыя дамы. Раней у архітэктурным абліччы горада, як правіла, пераважалі шэрыя тоны — цяпер уладараць светлыя. І ўжо толькі гэта, бясспрэчна, стварае ў магілёўцаў і гасцей горада добры настрой.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з фотаархіва інстытута.**

УНП 700014773.







**На здымках:**

**1.** Рэканструяваная вуліца Лазарэнкі.

**2.** Спартыўны комплекс «Алімпіец».

**3.** Дырэктар інстытута **Міхаіл КРАСНОЎ**.

**4.** Арыгінальнасцю вызначаюцца жылыя дамы, запраектаваныя ў інстытуце.

**5.** Галоўны інжынер інстытута **Сяргей ІРВАНЦОЎ**.

**6.** Начальнік групы навукова-тэхнічнай інфармацыі **Ніна БЕЛАЯ** (на здымку — злева) з маладымі інжынерамі свайго падраздзялення **Алай ДЗЯНІСАВАЙ** і **Вольгай ІВАСЕНКА**.

**7.** Праваслаўны храм, які ўзводзіцца па праекце інстытута.

**8.** У аграгарадку «Гарадзец» Шклоўскага раёна (уведзены па праекце інстытута).

**9.** У лабараторыі па даследаванні грунтоў. На здымку інжынер **Наталля ХАЛЬПУКОВА**.

**10.** «У рэдакцыйна-выдавецкім цэнтры працуе самае сучаснае абсталяванне», — зазначае тэхнік **Ларыса МУХІНА**.

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ЭЛЕМА»

(УНП 100074549)

Адрес: 220033, г. Минск, ул. Тростенецкая,5

**Бухгалтерский баланс на 01.01.2010 г.**

Единица измерения — млн.руб.

| Актив | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 31 355 | 32 838 |
| амортизация | 102 | 19 858 | 21 148 |
| остаточная стоимость | **110** | **11 497** | **11 690** |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 17 | 16 |
| амортизация | 112 | 14 | 13 |
| остаточная стоимость | **120** | **3** | **3** |
| Доходные вложения в материальные ценности: | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | - | - |
| амортизация | 122 | - | - |
| остаточная стоимость | **130** | - | - |
| Вложения во внеоборотные активы | **140** | **187** | **277** |
| В том числе: незавершенное строительство | 141 | - | - |
| Прочие внеоборотные активы | **150** | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **11 687** | **11 970** |
| **I I. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | **210** | **33 687** | **44 474** |
| В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 9 343 | 10 018 |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | 1 681 | 1 514 |
| расходы на реализацию | 214 | 169 | 313 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 15 591 | 18 168 |
| товары отгруженные | 216 | 6 659 | 13 230 |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | - | - |
| расходы будущих периодов | 218 | 244 | 1 231 |
| прочие запасы и затраты | 219 | - | - |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | **1 521** | **2 054** |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | - | - |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | **240** | **1 842** | **1 820** |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 367 | 448 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 65 | 55 |
| по налогам и сборам | 243 | 921 | 835 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 195 | 237 |
| разных дебиторов | 245 | 284 | 210 |
| прочая дебиторская задолженность | **249** | **10** | **35** |
| Расчеты с учредителями | **250** | - | - |
| Денежные средства: | **260** | 1 184 | 1 088 |
| В том числе | | | |
| денежные средства на депозитных счетах | 261 | 284 | - |
| Финансовые вложения | **270** | **69** | **69** |
| Прочие оборотные активы | **280** | **27** | **110** |
| **ИТОГО по разделу I I** | **290** | **38 330** | **49 615** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **50 017** | **61 585** |
| **ПАССИВ** | | | |
| **I I I. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | **410** | 537 | 537 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | **411** | - | - |
| Резервный фонд | **420** | **1 330** | **1 838** |
| В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | 1 330 | 1 330 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | - | - |
| Добавочный фонд | **430** | 12 412 | 12 946 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | **440** | - | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | **450** | 14 867 | 22 765 |
| Целевое финансирование | **460** | - | - |
| Доходы будущих периодов | **470** | - | - |
| **ИТОГО по разделу I I I** | **490** | **29 146** | **38 086** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | **510** | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | **520** | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | - | - |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | **610** | **1 077** | **821** |
| Кредиторская задолженность | **620** | **19 794** | **22 678** |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 17 496 | 20 519 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 453 | 199 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 892 | 1 009 |
| по прочим расчетам с персоналом | 624 | - | - |
| по налогам и сборам | 625 | 553 | 410 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 216 | 233 |
| по лизинговым платежам | 627 | - | - |
| перед прочими кредиторами | 628 | 184 | 308 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | **630** | - | - |
| Резервы предстоящих расходов | **640** | 1 | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | **650** | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **20 871** | **23 499** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **50 017** | **61 585** |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 19 794 | 22 678 |
| Материалы, принятые в переработку | 03 | 513 | 1 775 |
| Бланки строгой отчетности | 06 | 4 | 4 |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | 1 785 | 2 219 |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | 10 | 94 |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | 14 | 15 |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | 204 | 209 |

**Отчет о прибылях и убытках с 01 января по 31 декабря 2009 г.**

млн. руб.

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | **010** | 113 869 | 95 392 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 12 090 | 11 112 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | **020** | **101 779** | **84 280** |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | **030** | 77 140 | 68 397 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | **040** | **24 639** | **15 883** |
| Расходы на реализацию | **060** | 6 114 | 4 704 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **18 525** | **11 179** |
| **I I. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | **080** | 35 215 | 28 959 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | **081** | 72 | 18 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | **090** | **35 143** | **28 941** |
| В том числе: проценты к получению | 091 | 83 | 50 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | 2 | 2 |
| доходы от операций с активами | 093 | 35 046 | 28 887 |
| прочие операционные доходы | 099 | 12 | 2 |
| Операционные расходы | **100** | **34 962** | **29 050** |
| В том числе: проценты к уплате | 101 | - | - |
| расходы от операций с активами | 102 | 34 952 | 29 046 |
| прочие операционные расходы | 109 | 10 | 4 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100) | **120** | **181** | **- 109** |
| **I I I. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | **130** | 751 | 985 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | **140** | **751** | **985** |
| Внереализационные расходы | **150** | **5 213** | **3 474** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | **160** | **- 4 462** | **- 2 489** |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070±120±160) | **200** | **14 244** | **8 581** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | **210** | 856 | 1 431 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | **220** | 1 | 3 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **15 099** | **10 009** |
| Налог на прибыль | **250** | 3 595 | 2 365 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | **260** | 467 | 408 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | **270** | 15 | 13 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **10 167** | **5 795** |

### ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ по состоянию на 01 января 2010 г.

**Количество акционеров – 2447, в том числе физических лиц – 2447.**

**Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. руб. | 21 | 21 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 40 | 40 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тысяч рублей | 71 | 54,28 |
| Просроченная долгосрочная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 447 | 358 |
| Просроченная долгосрочная кредиторская задолженность | миллионов рублей | 640 | 537 |

Аудиторским заключением УП «Служба ведомственного контроля концерна «Беллегпром» бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Элема» сформирована в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверна, отражает финансовое положение Общества на 01 января 2010 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год, при этом совершенные ОАО «Элема» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Среднесписочная численность работающих (человек) — 1444.

Основной вид деятельности — производство верхней одежды.

Директор Л. И. Шавель
Главный бухгалтер С. Н. Хадаркевич

Казкі для дарослых

# ВЫХАД У БЛАКІТНЫМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У канцы жніўня іх запрасілі на вяселле... Запрашэнне было нечаканым — усе родныя, сябры і проста прыяцелі, якія хацелі б бачыць іх за сваім вясельным сталом, даўно пабраліся шлюбам.

— Дзіма жэніцца са сваёй краляй, — патлумачыў муж. — Я да апошняга не верыў, але, відаць, дзяўчына аказалася з характарам, прыбрала ўсё ж да рук...

Некалі Дзіма быў напарнікам Сяргея, у вольны ад асноўнай працы час яны ездзілі «па заказах» — рабілі рамонты. Першы шлюб у Дзімы не склаўся. А не склаўся, таму што сам Дзіма яго і разваліў. Калі пачаўся будаўнічы «бум» і ўсе навокал, як звар'яцелыя, кінуліся перапланоўваць і рамантаваць сваю «сацыялістычную нерухомасць» — заказы пасыпаліся адусюль. З імі прыйшлі і грошы. Дзіма (па прычыне маладосці і глупства) прызвычаіўся да рэстаранаў і ўсяго, што з гэтага выцякала. Так ён пазнаёміўся з Юляй. Пазнаёміўся — гучна сказана. Проста аднойчы раніцай прачнуўся ў чужой кватэры і чужым жа ложку. Побач спала дзяўчына. Ён разбудзіў яе і спытаў, хто яна такая і дзе яны знаходзяцца. Дзяўчына засмяялася і патлумачыла, што завуць яе Юляй, а знаходзяцца яны ў яе дома, куды прыехалі ўчора на таксі. І што на мабільны яму некалькі разоў тэлефанавала жанчына, якая не захацела сябе назваць і якую Юля папрасіла пазваніць пазней, калі «абанент» прачнецца і будзе даступным.

Дзімава жонка не адносілася да катэгорыі жанчын, якім падабаюцца жарты падобнага кшталту. Дараваць такое нахабства яна не змагла і назаўсёды выкрасліла мужа са свайго жыцця. Так адначасова Дзімыч стаў халасцяком і памяняў месца жыхарства — ісці яму не было да каго, акрамя Юлі. Гады два яны праіснавалі на адной жылплошчы вольнымі птушкамі, і вось вам нечаканы фінал — вяселле...

— Што, і белы вэлюм будзе? — кпліва пацікавілася Вольга, разглядваючы запрашэнне. Яна ненавідзела такіх жанчын — драпежніц, разбуральніц, паляўнічых за чужым шчасцем. Яны заўсёды з'яўляюцца на гатовае — калі мужчына ўжо не жаўтароты юнак, а сфарміраваная (у многім не без дапамогі жонкі) асоба з пэўным становішчам і банкаўскім рахункам. З'яўляюцца — і пачынаюць свае правы правіць, нічога пры гэтым сабой не ўяўляюць. Што ў іх ёсць? Доўгія худыя ногі і выбеленыя фарбай валасы? Мора нахабства і амбіцый? І гэта дае ім права ўрывацца ў чужое жыццё, браць мужчыну за руку і цягнуць у свой ложак? А тыя таксама добрыя — не надта і супраціўляюцца. Правільна мама казала: калі праз дзесяць гадоў сумеснага жыцця твой муж усё яшчэ каля цябе, значыць, ён проста нікога ўсур'ёз не зацікавіў...

Вольга цішком паглядзела на Сяргея, як бы «прабеглася» па ім поглядам... Яна рабіла так заўсёды, калі хацела адчуць яго настрой. Пятнаццаць гадоў яны жывуць пад адным дахам, і за ўвесь час у яе не было ніводнай сур'ёзнай падставы для рэўнасці. Напачатку Вольга, праўда, напружвалася, калі з працы яму тэлефанавалі жаночыя «галасы». Але з часам прывыкла — ну што зробіш, калі мужу пашанцавала з калектывам. Потым Дзіма стаў браць Сяргея на «заказы», праз некалькі гадоў яны адкрылі сваю невялікую фірму. Сяргей стаў радзей бываць дома, але прыносіў больш грошай. Калі ехаў да кліента ў іншы горад, заўсёды папярэджваў яе, пакідаў усе магчымыя «каардынаты» — адрасы, нумары тэлефонаў. І ніводнага разу не «пракалоўся» — не было такога, каб яна патэлефанавала, а ёй казалі: маўляў, Сяргей «толькі што выйшаў». Ён быў чалавекам слова і ніколі сваё слова не парушаў. Вольга ведала гэта, але часам не магла адмовіць сабе ў задавальненні ўзяць мужа «на понт». «А што гэта за бландзінка выходзіла ўчора з тваёй машыны?» — магла спытаць яна знянацку, калі ўвечары, паклаўшы дачку спаць, яны ціха-мірна сядзелі перад тэлевізарам. Муж ніколі не губляўся — ён падхопліваў гульню і аддаваў «пас» назад: «А што гэта за вусаты брунет чакаў цябе ля выхаду з крамы?». Ніякіх вусатых брунетаў у Вольгі не было ды і быць не магло — яму проста не знайшлося б месца ў яе жыцці, раскладзеным па палічках і арганізаваным так, каб усім было зручна: мужу, дачцэ, ёй самой...

— Безумоўна, Юля будзе ў вэлюме і ў белай сукенцы — усё ж для яе гэта першы шлюб. Сукенка з нямецкага каталога — Дзімыч нават паказваў мне фота. Там такое ўсё адкрытае — спіна, плечы... Ну, Юльцы ж ёсць што прадэманстраваць! — муж прыцмокнуў языком і тэатральна закаціў вочы.

Вольга вырашыла не чапляцца да апошняй фразы, хоць вельмі карцела. Яна адчыніла шафу і пагрузілася ў яе нетры. Задача была не з лёгкіх — выбраць адзенне на вяселле. Не надта кідкае — ёй не сямнаццаць гадоў, але і не празмерна сціплае, з шэрагу «бывай, маладосць» або «бабуліна мара». Усё ж Дзіма на цэлых дзесяць гадоў маладзейшы за Сяргея, а Юлька дык і ўвогуле «дзіцячы сад». Так што ніякага афіцыёзу, белае з чорным не апранаць! Ружовае — занадта наіўна, жоўтае — крыкліва, зялёнае — сумна... Блакітнае? Напэўна, блакітнае... Яна сцягнула з плечыкаў лёгкую, свабодную, напаўпразрыстую сукенку-туніку насычанага блакітнага колеру з паступовым пераходам у белае. Якраз тое, што трэба. Пакруцілася перад Сяргеем.

— Ну... не ведаю, — паціснуў ён плячыма. — Адчуваецца нейкі выклік. Гэткая Дыяна на паляванні. Рукі голыя, ногі голыя... Па-мойму, твой выгляд будзе не зусім адпавядаць моманту.

— Значыць, вырашана — апранаю! — засмяялася Вольга.

...У прызначаны дзень яны пад'ехалі да рэстарана раней за ўсіх — «падвяла» Вользіна педантычнасць. Яна не выносіла ніякіх спазненняў куды б там ні было, цярпець не магла людзей, якія спазняюцца на сустрэчы, і ніколі не дазваляла сабе непунктуальнасці... Па пустынным дворыку рэстарана вецер ганяў лісце, якое пачынала ўжо жаўцець. За столікамі на тэрасе сядзелі адзінокія госці. Адзін з іх падняўся і пайшоў ім насустрач. Прыязна, як стары знаёмы, павітаўся з Сяргеем і павярнуўся да Вольгі. Адрэкамендаваўся:

— Саша, брат жаніха.

— Не ведала, што ў Дзімы ёсць малодшы брат, — здзівілася яна.

— А я стрыечны. І розніца ва ўзросце ў нас усяго некалькі дзён, — удакладніў ён і мякка пацісну Вользіну далонь.

Пад'ехаў вясельны картэж... З «мерседэса» выйшаў шчаслівы наваспечаны муж, за ім белай аблачынкай выпырхнула Юлечка... Убачыўшы, што Дзімыч падышоў да машыны, у якой ехалі сваякі, яна скрывіла роцік і паклікала патрабавальна: «Мілы, хадзі сюды! Вазьмі мяне на рукі!». Дзіма з радаснай усмешкай на твары кінуўся выконваць жаданне сваёй «паловы».

— Калі мужчына ідыёт, гэта невылечна, — пачула Вольга за спіной ужо знаёмы голас. Азірнулася — Саша. Ён не глядзеў на яе, але гаварыў менавіта з ёю, Вольга адчувала гэта.

— Чаму ідыёт? — спытала яна.

— Таму што толькі ідыёт мог ажаніцца з такой дурніцай, — адказаў ён спакойна, быццам канстатуючы факт, які нельга ўжо папраціць.

— Навошта ж драматызаваць сітуацыю? — усміхнулася Вольга. — Калі ўсё менавіта так, з іх атрымаецца шчаслівая пара.

Сяргей пацягнуў яе за руку — госці ўжо займалі месцы за сталом у банкетнай зале. Зала аказалася кампактнай і ўтульнай. Іх пасадзілі непадалёк ад маладых. Вольга падняла вочы, каб агледзецца і ацаніць суседзяў. Насупраць сядзеў Саша. Гэта падалося ёй дзіўным, нават крыху непрыстойным, таму што ўсе маладыя дзяўчаты і хлопцы згрупаваліся за іншым канцом стала. І яго знаходжанне тут, сярод сямейных пар, магло быць успрынята неадназначна.

— За маладых! — выклікнуў тамада, і ўсе дружна ўзнялі келіхі з шампанскім.

— За прыгожых жанчын! — сказаў Саша, залпам асушыў свой келіх і выразна паглядзеў на Вольгу. Дзякуй богу, што Сяргей, заняты размовай са сваёй суседкай, нічога не заўважыў. Сітуацыя станавілася небяспечнай. Вольга чула кожны ўдар свайго сэрца. Мала таго, ёй падавалася, што гэта чуюць усе, хто сядзіць побач... Аднак людзі навокал паводзілі сябе звычайна — елі, пілі, весяліліся, расказвалі анекдоты. Ніхто не звяртаў на яе ніякай увагі...

— А цяпер, — абвясціў тамада, — мне патрабуецца адзін смелы мужчына і адна жанчына без комплексаў! Спадзяюся, сярод вас такія ёсць?

— Ёсць! — Вольга рэзка паднялася са свайго месца. Ёй было абсалютна ўсё роўна, куды ісці, абы не сядзець за сталом, уздрыгваючы ад пранізлівых позіркаў:

— Та-а-ак, цудоўненька, — пацёр рукі тамада. — А хто ж будзе вашым партнёрам?

Краем вока Вольга заўважыла ажыўленне ў шарэнгах мужчын. Нават Сяргей прыўзняўся са свайго месца, раздумваючы, ці варта дзеля жонкі прыпыняць размову з абаяльнай суседкай.

— Вось і наш герой! А хто не паспеў — той спазніўся і няхай цяпер кусае сябе за локці! — заліваўся салаўём тамада, старанна адпрацоўваючы шчодры ганарар, выдадзены Дзімычам напярэдадні... Убачыўшы побач Сашу, Вольга не здзівілася. Напэўна, яна больш здзівілася б, калі б ён застаўся за сталом.

— А цяпер нашы дарагія... э-э-э... Оля і Саша пакажуць маладым, як трэба цалавацца! Праўдуць, так бы мовіць, бясплатны майстар-клас. Падтрымаем іх, спадары! Апладысменты!

З месцаў пачалі апладзіраваць... Ён зрабіў крок насустрач Вользе, рашуча і разам з тым пяшчотна ўзяў яе твар у свае далоні і павярнуў да сябе. Яна паспела заўважыць, што вочы ў яго карыя... І паляцела ў бездань...

Усё далейшае адбывалася як у сне. Людзі, галасы, музыка, святло — усё пераплялося, страціла свае абрысы і значэнне... Вольга памятала, як муж упрошваў яе паехаць дадому. Яна не пагадзілася, і ён паехаў адзін. Як яна радавалася гэтаму, якая была шчаслівая!.. Ёй здавалася, што знікла апошняя перашкода на яе шляху... Потым яны з Сашам стаялі на тэрасе і глядзелі на зоркі. Ён прыціскаў да свайго гарачага твару яе далоні, цалаваў іх і гаварыў пра тое, якая яна прыгожая ў сваёй нябесна-блакітнай сукенцы. І што ў яго ад яе блізкасці заходзіцца сэрца і спыняецца дыханне... Да іх падыходзілі нейкія людзі, пра нешта пыталіся. Але ім было ўсё роўна, яны не рэагавалі на тое, што не датычылася непасрэдна іх... У яго кішэні зазвінеў мабільны, але Саша не адразу гэта зразумеў... Званок быў настойлівы, трывожны. Гэткім жа ўстрывожаным стаў яго твар, калі на «тым канцы» аб нечым паведамілі. «... Ніна Паўлаўна, прашу вас, будзьце побач, нікуды не адыходзьце!.. Я ўжо еду!» — сказаў ён у трубку, і Вольгу абдало холадам. Ён яшчэ трымаў яе руку ў сваёй, але яна не адчувала ранейшага цяпла.

— У мяне жонка павінна нарадзіць... Яна не хацела, каб я ішоў на гэта вяселле... А цяпер суседзі патэлефанавалі, кажуць, схваткі пачаліся, «хуткую» выклікалі, а яна баіцца без мяне ў бальніцу ехаць... Мне трэба ісці. Я абавязкова патэлефаную табе... Даруй!

...У пустой зале афіцыянткі прыбіралі са сталоў посуд. «Вам каго? — спытала не вельмі прыязна адна з іх. — Вяселле закончылася, усе раз'ехаліся па дамах». Вольга развярнулася і пайшла ў бок выхаду, стараючыся не зачапіцца за што-небудзь і не ўпасці. Па яе твары беглі слёзы, але плечы яна трымала роўна... Афіцыянтка яшчэ некаторы час глядзела ёй услед і думала пра тое, што жанчыны ў такіх сукенках не могуць быць нешчаслівымі.

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

**УТВЕРЖДЕНО:**
Решением Наблюдательного Совета
ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»
Протокол № 8 от 03.03.2010 г.

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
### ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

**1. Наименование.**

На белорусском языке:

полное – адкрытае акцыянернае таварыства «Беларускі Індустрыяльны Банк»;

сокращенное – ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк». На русском языке:

полное – открытое акционерное общество «Белорусский Индустриальный Банк»;

сокращенное – ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

**2. Место нахождения, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

Юридический и почтовый адрес: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мельникайте, 8. тел./факс (8 017) 209 41 85, адрес в интернете: www.bib.by, e-mail: bib@bib.by.

**3. Номера расчетных счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.**

№ 3811800009020 в ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», код 725 (для юридических лиц – не банков).

№ 1811800009022 в ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», код 725 (для юридических лиц – банков).

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность.**

Бухгалтерская отчетность эмитента публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным, также с данной информацией можно ознакомиться на сайте ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» по адресу: www.bib.by.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его местонахождение, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия лицензии.**

ЗАО «Агрокапитал», расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 5-23, лицензия Министерства финансов Республики Беларусь № 02200/0385573 от 27.07.2007 г., срок действия лицензии до 29.07.2012 г.

**6. Размер уставного фонда, количество акций по категориям и типам привилегированных акций, номинальная стоимость акции.**

Сумма зарегистрированного уставного фонда составляет 22 460 096 401 (Двадцать два миллиарда четыреста шестьдесят миллионов девяносто шесть тысяч четыреста один) белорусский рубль.

Уставный фонд состоит из 3 159 389 (Три миллиона сто пятьдесят девять тысяч триста восемьдесят девять) акций, из них простых (обыкновенных) акций 3 154 665 (Три миллиона сто пятьдесят четыре тысячи шестьсот шестьдесят пять) штук и привилегированных акций 4724 (Четыре тысячи семьсот двадцать четыре) штуки. Номинальная стоимость акций – 7109 (Семь тысяч сто девять) рублей.

**7. Дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Открытое акционерное общество «Белорусский Индустриальный Банк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 30 октября 1991 года под номером 23.

Банк является правопреемником общества с ограниченной ответственностью «Коммерческий банк «Профбанк» (Протокол № 1 собрания учредителей от 30 мая 1995 года).

**8. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.**

Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:

- в головном офисе ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 с ***9.00*** до ***16.00;***

- на интернет-сайте эмитента: www.bib.by.

**9. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение.**

Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» 03 марта 2010 года, Протокол № 8.

**10. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.**

К открытой продаже предлагаются ***1 000*** *(Одна тысяча)* именных дисконтных облигаций в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).

Серия ***«БI-5»***, номера ***«0001 – 1000»***.

Объем эмиссии составляет ***1 000 000*** *(Один миллион)* долларов США.

**11. Номинальная стоимость облигаций.**

Номинальная стоимость облигаций – ***1 000*** *(Одна тысяча)* долларов США.

**12. Цель выпуска облигаций.**

Облигации выпускаются с целью привлечения свободных денежных средств юридических лиц для формирования ресурсной базы банка.

**13. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Облигации выпускаются без обеспечения в соответствии с подпунктом 1.8. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 года № 277.

**14. Сведения о согласовании выпуска облигаций с Национальным банком Республики Беларусь.**

Выпуск облигаций осуществляется в пределах восьмидесяти процентов от суммы нормативного капитала по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь.

Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от «12» марта 2010 г. № 50.

**15. Период проведения открытой продажи облигаций.**

Дата начала продажи: ***02 апреля 2010 года.***

Дата прекращения продажи: ***02 марта 2011 года.***

**16. Место и время проведения открытой продажи облигаций.**

Открытая продажа (размещение) осуществляется:

- на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 ежедневно в течение банковского дня на основании договора открытой продажи (размещения) облигаций;

- на биржевом рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с регламентом торгов.

**17. Срок обращения облигаций.**

Срок обращения облигаций: ***с 02 апреля 2010 года до 04 апреля 2011 года (367 дней).***

**18. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций.**

Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 в ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» с ***9.00*** до ***16.00*** в рабочие дни, начиная с ***04 апреля 2011 года.***

Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Владельцы облигаций обязаны прекратить все сделки с облигациями за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций.

Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего держателя, указанного в реестре владельцев облигаций ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», сформированном депозитарием эмитента за 5 рабочих дней до наступления срока погашения облигаций. Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о банковских реквизитах владельцев облигаций, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете банка до непосредственного обращения владельца облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

При погашении облигаций владельцам возмещается номинальная стоимость облигаций денежными средствами в сумме и валюте номинала облигации в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**19. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.**

Цена продажи облигаций в период открытой продажи устанавливается из расчета доходности – 10 % годовых к погашению.

В период открытой продажи облигации размещаются по цене, которая рассчитывается по формуле:

$$Ц = \frac{Н*365*100}{Д*К+365*100},$$

где:

Ц – цена продажи облигаций;

Н – номинальная стоимость облигаций (1 000 (Одна тысяча) долларов США);

Д – доходность, установленная при выпуске (10 % годовых);

К – количество дней до погашения облигаций.

Количество дней до погашения облигаций определяется с дня их продажи по день погашения. При этом день продажи и день погашения считаются одним днем.

Текущая стоимость облигаций рассчитывается по следующей формуле:

$$Тс = Ц + \frac{Ц*Д*К}{365*100},$$

где:

Тс – текущая стоимость облигаций;

Ц – цена облигации, определенная эмитентом в день начала открытой продажи;

Д – доходность, установленная при выпуске (10 % годовых);

К – количество дней обращения облигаций.

Количество дней обращения облигаций определяется с дня их открытой продажи (размещения) по день расчета их текущей стоимости. При этом день начала открытой продажи (размещения) и день расчета их текущей стоимости считаются одним днем.

Расчет цены продажи и текущей стоимости облигаций осуществляется исходя из фактического количества дней в году.

Продажа облигаций осуществляется по цене ниже номинальной стоимости.

Доходом у держателя облигаций является дисконт, который в случае приобретения облигаций до погашения рассчитывается по формуле:

$$Д = Н - Ц$$

где,

Д – дисконт (доход);

Н – номинальная стоимость облигаций (1 000 (Одна тысяча) долларов США);

Ц – цена продажи облигации.

В случае досрочного выкупа облигаций эмитентом доход рассчитывается по формуле:

$$Д = Цв - Ц$$

где,

Д – дисконт (доход);

Цв – цена выкупа эмитентом;

Ц – цена продажи облигации.

**20. Минимальная цена продажи облигаций.**

Минимальная цена продажи облигаций составляет 908,64 (Девятьсот восемь долларов США шестьдесят четыре цента).

**21. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций.**

Эмитент производит возврат денежных средств не позднее 10 рабочих дней со дня запрета выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

**22. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций.**

Эмитент имеет право выкупать облигации по договорной цене в течение всего срока обращения. Выкуп облигаций осуществляется эмитентом на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и/или на биржевом рынке в порядке, установленном ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Эмитент имеет право продавать на вторичном рынке облигации по договорным ценам.

Эмитент имеет право досрочно погасить облигации с прекращением обязательств по облигациям в силу совпадения должника и кредитора в одном лице согласно статье 383 Гражданского кодекса Республики Беларусь (в случае выкупа всего объема эмиссии облигаций).

Эмитент имеет право совершать иные операции с облигациями, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Конвертация облигаций не производится.

**23. Дата и номер государственной регистрации облигаций.**

№ 5-200-02-0521 от 24 марта 2010 года.

**Председатель Правления Киреев А.Е.**

**Главный бухгалтер Кузьмицкая Н.А.**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 20 от 30.11.2009 г., ОАО «Белорусский Индустриальный Банк». УНП 100195493.

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ОАО «БЕЛСОЛОД» за 2009 год

225800, г. Иваново Брестской обл., ул. Полевая, 32

Основной вид деятельности: производство солода

**1. ИНФОРМАЦИЯ о дивидендах и акциях, количестве акционеров, задолженности:**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров всего | лиц | 2597 | 2600 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 3 | 3 |
| физических лиц | лиц | 2594 | 2597 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 26 | 5820 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 0,24 | 53,15 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тыс. руб. | 0,83 | 0,74 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | - | - |
| Просроченная дебиторская задолженность (долгосрочная) | млн руб. | - | - |
| Просроченная кредиторская задолженность (долгосрочная) | млн руб. | - | - |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 458 | 431 |

**2. БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2010 года (в млн руб.):**

| Наименование показателя | На начало года | На конец отчетного года |
|---|---|---|
| **АКТИВ** | | |
| Внеоборотные активы | 58203 | 149061 |
| Оборотные активы | 85241 | 111885 |
| Баланс | 143444 | 260946 |
| **ПАССИВ** | | |
| Капитал и резервы | 82247 | 94071 |
| Долгосрочные обязательства | 17848 | 115560 |
| Краткосрочные обязательства | 43349 | 51315 |
| Баланс | 143444 | 260946 |

**3. ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ (в млн руб.):**

| Наименование показателя | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 34522 | 76124 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 32353 | 48344 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 1575 | 26903 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 985 | 948 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 683 | -265 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 1842 | 26258 |
| Чистая прибыль (убыток) | 2310 | 22871 |
| Сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 0 | 3036 |
| Сумма полученной прибыли по конечному финансовому результату | 2310 | 22871 |

**4. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: солод пивоваренный.**

**Генеральный директор ОАО «Белсолод» Н.Н. Кенда**

**Главный бухгалтер ОАО «Белсолод» Г.А. Шикеля**

Данные отчетности подтверждены аудиторским заключением от 26 февраля 2010 года, выданным ИП Афанасьевой Л.С. лицензия № 02200/0495311 Министерства Финансов РБ от 19.12.2008 г.

УНП 200075434.

